

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ДЛЯ САМАКАТЧЫКАЎ І ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ 11

КУРОРТНАЕ МІНУЛАЕ І МАСТАЦКАЯ БУДУЧЫНЯ НАРОЎЛІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 174 (29796)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Узбуйненне гаспадарак — правільны пасыл, але ён своеасаблівы. Хтосьці ўзбуйняецца за кошт буйной рагатай жывёлы, малочнай жывёлагадоўлі, хтосьці пашырае птушкагадоўлю. Нехта пачынае з правільнага вядзення гаспадарчай дзейнасці на зямлі. Але, зноў жа, далей усё будзе паэтапна, каб далучэнне гаспадарак не дазволіла самому інтэгратару зваліцца, не справіўшыся са сваімі абавязацельствамі. Таму ў гэтым пытанні трэба ісці кропкава і акуратна, маючы на ўвазе, што ўзбуйненне прадпрыемстваў — толькі адзін з фрагментаў удасканалення АПК Беларусі».*

**КОРАТКА**

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў афіцэраў, ветэранаў і служачых Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл з 80-годдзем утварэння аб'яднання.**

• У Мінпрыроды анансавалі экалагічнае мерапрыемства па прыборцы смецця «Мы клапоцімся». Удзельнікамі могуць стаць каманды навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

• **У Белгідрамеце адзначаюць спад узроўняў вады ў рэках Беларусі.**

• Імёнамі ганаровых грамадзян Пінскага раёна назавуць вуліцы ў новым квартале прыгарадней забудовы.

• **Мінск адзначыць Дзень горада алімпійскім квэстам, канцэртамі, гастрафэстам і феерверкам.**

ISSN 1990 — 763X

I мы там былі



# ПАЭТЫЧНАЯ ДУША ПАЛЕССЯ

## Як Добруш адсвяткаваў XXIX Дзень беларускага пісьменства

**Святкаванне XXIX Дня беларускага пісьменства ў Добрушы завяршылася. За гэтыя два дні падзей адбылося шмат: адкрылі помнік народнаму пісьменніку Беларусі, ураджэнцу Гомельшчыны Івану Шамякіну, згадалі 140-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама ўручылі Нацыянальную літаратурную прэмію. І гэта толькі маленькая частка з таго, што арганізатары падрыхтавалі для гасцей і жыхароў Добруша. Як горад мастоў адзначыў галоўнае літаратурнае свята краіны, чытайце ў рэпартажы «Звязды».**



Фота БелТА.

Калі ўязджаеш у Добруш на аўтобусе, горад адразу сустракае сваімі галоўнымі сімваламі: папяровай фабрыкай, якая была пабудавана ажно ў 1870 годзе графам і генерал-ад'ютантам Фёдарам Паскевічам, а таксама ракой Іпуццю. Менавіта дзякуючы ёй горад атрымаў прыгожае параўнанне з Венецыяй: шматлікія астраўкі і затокі, утвораныя Іпуццю, аплятаюць Добруш. Калі вы прагуляецеся па горадзе, то знойдзеце 15 мастоў.

На адным з берагоў размясціліся палаткі часоў Вялікай Айчыннай вайны, у неба падымаецца дымок ад вогнішча: гэта ваенна-гістарычная рэканструкцыя, якая расказвае аб партызанскім лёсе Добруша. Але мы накіроўваемся крыху далей, у цэнтр горада, дзе адбываюцца галоўныя падзеі свята.





### СТВАРЫЦЬ ПАРТРЭТЫ ПЕСНЯРОЎ

Сёлета перад арганізатарамі стаяла нялёгкая задача: адлюстраваць адразу некалькі важных для гісторыі нашай краіны і культуры дат. Да Года гістарычнай памяці, 140-гадовага юбілею з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі былі створаны адмысловыя павільёны. Падыходзячы да пляцоўкі «алмаза ведаў», адразу заўважаю вялікі фаліянт, які гартаюць наведвальнікі:

— Да юбілею Брэста мы выдалі Брэсцкую Біблію. У Беларусі ёсць усяго два яе факсімільныя выданні, адно з якіх захоўваецца ў самім горадзе, а другое — у бібліятэцы Акадэміі навук, — распавядае **галоўны бібліятэкар сектара арганізацыі кніжных выставак Нацыянальнай бібліятэкі Святлана ЗАЙКО.** — Таксама для наведвальнікаў мы зрабілі інтэрактыўную зону: можна прыняць удзел у віктарыне і атрымаць невялікі сувенір ад бібліятэкі.

**СТАР. 3**

Ёсць пытанне

# АСЯРОДДЗЕ ДЛЯ ЎСІХ?

## Што зменіць новы закон аб сацыяльнай інтэграцыі

**Далёкае ад абывацеля паняцце безбар'ернага асяроддзя насамрэч істотна мяняе жыццё людзей з інваліднасцю. Калі раней можна было толькі марыць пра рэдкія выхады з уласнай кватэры з чыёйсьці дапамогай, то сёння дзякуючы пад'ёмнікам, пандусам і іншым прыстасаванням гэта цалкам рэальна. Як і ўладкаванне на працу, заняткі ў гуртках, паездкі на транспарце. Сёлета прыняты Закон «Аб правах інвалідаў і сацыяльнай інтэграцыі». У яго аснову леглі галоўныя палажэнні адпаведнай міжнароднай канвенцыі і пытанні, якія наспелі і мелі неабходнасць урэгулявання ў прававым полі. Як змены ў заканадаўстве паўплываюць на жыццё людзей з інваліднасцю і як на практыцы рэалізоўваецца паняцце безбар'ернага асяроддзя, расказалі спецыялісты.**

### МЕСЦЫ НА ПАРКОЎКАХ І ГІД

— Калі раней мы казалі пра стварэнне безбар'ернага асяроддзя і акцэнтавалі ўвагу ў асноўным на ўмовах для інвалідаў-калясачнікаў, то сёння імкнёмся да забеспячэння беспрашкоднага доступу на аб'екты сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры, вулічна-дарожнай сеткі ўсіх грамадзян, — кажа **кансультант упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КАПУРА.**

**СТАР. 7**

# СЛОВА МАЛАДЫХ

**Учора, напярэдадні юбілею Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, у Мінску ў скверы Марата Казея, каля помніка піянеру-герою, прайшло адно з цэнтральных патрыятычных мерапрыемстваў святкавання 20-годдзя маладзёжнай арганізацыі з удзелам актыву БРСМ і БРПА.**



**Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне грамадскаму аб'яднанню «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ў сувязі з 20-годдзем з дня ўтварэння.**

**«Сёння, аб'ядноўваючы сотні тысяч маладых патрыётаў краіны, арганізацыя ўносіць значны ўклад у захаванне і прымнажэнне найлепшых традыцый маладзёжнага руху Беларусі. Яна стала стартавай пляцоўкай для многіх ініцыятыў і сапраўдным сацыяльным ліфтам для юных талентаў.**

**БРСМ трэба і далей актыўна развіваць студатрадаўскія і валанцёрскія праграмы, удзяляць увагу стварэнні і рэалізацыі праектаў, звязаных з уладкаваннем гарадоў і вёсак, захаваннем гістарычнай памяці аб подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, уцягваючы ў грамадска карысныя справы нашу моладзь.**

**Заўсёды ідзіце наперад, ніколі не спыняйцеся на дасягнутым. Любіце сваю краіну і смела змагайцеся за праўду», — сказана ў віншаванні.**

Удзел у ім узялі 20 равеснікаў БРСМ з розных рэгіёнаў Беларусі: студэнты, курсанты, моладзь, якая працуе, — усе яны нарадзіліся ў 2002 годзе, падчас стварэння арганізацыі. Адна з галоўных акцый удзельнікаў мерапрыемства — зварот да сваіх нашчадкаў — моладзі 2052 года.

У Год гістарычнай памяці моладзь усклала кветкі да бронзавага манумента Героя Савецкага Саюза юнаму партызану-разведчыку Марату Казею. Затым упершыню адбылася ўрачыстая цырымонія развітання з піянерскім гальштукам з наступным уручэннем маладзёжных білетаў новым членам БРСМ. Шэрагі маладзёжнай арганізацыі папоўнілі дваццаць 14-гадовых піянераў сталіцы. Правялі ўрачыстасць першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Лук'янаў і старшыня Цэнтральнага савета БРПА Аляксандра Ганчарова.

Што ж датычыцца паслання, якое распячатаюць 6 верасня 2052 года, то яго зачытала актывістка БРСМ Анастасія Ярашчанка з Віцебскай вобласці. «Сёння спаўняецца 50 гадоў з дня ўтварэння Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — вядучай маладзёжнай арганізацыі нашай краіны, каля вытокаў стварэння якой у 2002 годзе стаяў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, — гаворыцца ў пасланні. — У наш час маладзёжная палітыка стала найважнейшым складнікам стратэгіі дзяржаўнага развіцця з апорай на моладзь. А мы, маладое пакаленне патрыётаў пачатку XXI стагоддзя, якое вырасла ў суверэннай і незалежнай краіне пад мірным небам, неслі адказнасць за свой гістарычны перыяд і з гонарам памнажалі брэнды сучаснай Беларусі. Упэўненыя, што і праз трыццаць гадоў нязменнымі найлепшымі якасцямі беларускай моладзі па-ранейшаму з'яўляюцца адказнасць, прыстойнасць і працавітасць, а вы жывяце сваім розумам і працай у прыгожай і любімай краіне».

Паводле слоў **першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра ЛУК'ЯНАВА**, цырымонія развітання з піянерскім гальштукам і ўступлення ў рады БРСМ вельмі сімвалічная. «Піянерскі гальштук, знак БРСМ — тыя сімвалы, элементы, якія нас аб'ядноўваюць. І сёння, запусціўшы ў гэтым святым месцы гэты праект, мы разлічваем, што ён стане неад'емнай часткай рытуальных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ва ўстановах адукацыі краіны. Вельмі важна, каб момант уступлення ў шэрагі арганізацыі для кожнага з вас застаўся той цаглінкай у будаўніцтве дарогі вашага асабістага станаўлення», — адзначыў ён.

**Крысціна ДУБОЎСКАЯ.**



Напярэдадні падзеі

# «Белая Русь» запускае грамадска-палітычны марафон «17 граняў адзінства»



**Па словах старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання Алега РАМАНАВА, буйны грамадска-палітычны марафон «17 граняў адзінства» «Белая Русь» праводзіць ва ўзаемадзеянні з рэспубліканскім дзяржаўна-грамадскім аб'яднаннем «Беларускае таварыства «Веды» — гэта іх сумесны праект.**

З 6 да 15 верасня ў 17 рэгіёнах краіны пройдуць грамадска-палітычныя форумы. «Іх спецыфіка ў тым, што тут няма мэты нешта расказаць, навучыць, наадварот, мы хочам паслухаць меркаванні актывістаў, якія выкажуцца па найбольш значных пытаннях парадку дня і прапануюць свае шляхі вырашэння вострых грамадскіх праблем», — сказаў Алег Раманаў.

У ходзе марафону будзе арганізаваны дыялог па такіх напрамках, як патрыятычныя каштоўнасці беларускага народа, нацыянальная ідэя беларускай дзяржавы, гістарычны шлях развіцця, грамадскі запыт на партыйнае будаўніцтва на сучасным этапе развіцця грамадзянскай супольнасці Беларусі. «Акрамя таго, будзе абмяркоўвацца наш цывілізацыйны выбар — далейшае развіццё адносін з РФ, краінамі калектыўнага Захаду і трэцяга свету, а таксама шляхі далейшага развіцця «Белай Русі», — дадаў старшыня аб'яднання. Марафон завершыцца падрыхтоўкай буйнога аналітычнага дакумента, у якім будзе адлюстравана меркаванне грамадзянскай супольнасці па гэтых тэмах.

«Мы ўпэўнены, што нашы актывісты маюць сваё бачанне па гэтых пытаннях. Магчыма, з часам яны стануць вядучымі спікерамі нашай краіны, людзьмі, якія будуць абмяркоўваць сумесна з прызнанымі ўжо экспертамі, палітолагамі тое, што хвалюе беларускае грамадства», — адзначыў Алег Раманаў.

Акрамя таго, «Белая Русь» плануе шмат мерапрыемстваў як у сталіцы, так і ва ўсіх рэгіёнах краіны. Яны будуць накіраваны на тое, каб захаваць памяць аб гісторыі, не даць яе сказіць, сфарміраваць спелую палітычную культуру грамадзян Беларусі.

**Аляксей КАРПУК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кошт газу ў Еўропе вырас на 30 працэнтаў на фоне спынення паставак па «Паўночным патоку»

**Цэны на газ у Еўропе на адкрыцці таргоў раслі больш як на 30 працэнтаў і зноў дасягнулі $2900 за 1 тыс. м³, вынікае з даных таргоў лонданскай біржы ICE. Гэта адбываецца на фоне спынення паставак расійскага газу па «Паўночным патоку», паведамляе РІА «Навіны».**

Кошт кастрычніцкага ф'ючарса на адкрыцці таргоў на найбуйнейшым еўрапейскім хабе TTF дасягнуў $2810,5 за 1 тыс. м³. Максімальна ў ходзе сённяшніх таргоў цэны на газ дасягалі $2917,4 за 1 тыс. м³.

Раней «Газпрам» паведаміў, што газаправод «Паўночны паток», работа якога была планава спынена на тры дні (з 31 жніўня да 3 верасня) у сувязі з правядзеннем тэхабслугоўвання, не зможа пакуль аднавіць работу з-за ўцечкі масла на агрэгаце Trent 60.

## МЗС Расіі паведаміла аб гібелі двух супрацоўнікаў пасольства ў Афганістане ў выніку тэракта

**Два супрацоўнікі расійскага пасольства ў Афганістане загінулі ў выніку тэракта, паведаміла расійскае знешнепалітычнае ведамства.**



«5 верасня ў 10.50 па кабульскім часе ў непасрэднай блізкасці ад уваходу ў консульскі аддзел пасольства Расіі ў Кабуле невядомы баявік прывёў у дзеянне выбуховае прыстасаванне. У выніку атакі загінулі два супрацоўнікі дыпмісіі, сярод афганскіх грамадзян таксама ёсць пацярпелыя. Пасольства знаходзіцца ў шчыльным кантакце са службамі бяспекі Афганістана, якія праводзяць расследаванне», — адзначаецца ў паведамленні.

Мясцовыя СМІ паведамлялі аб тым, што ў выніку выбуху загінулі не менш як 20 чалавек. Выбух адбыўся каля брамы расійскага дыпведамства ў Кабуле, размешчанага на вуліцы Дар-уль-Аман.

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што меры па ахове расійскага пасольства ў Кабуле ўзмоцнены, у тым ліку з прыцягненнем дадатковых сіл «талібскіх улад» і контрразведкі Афганістана.

## Бербак падтрымала ідэю пераходу да прыняцця рашэнняў у ЕС большасцю галасоў




**Перайсці да сістэмы прыняцця рашэнняў у Еўрасаюзе на аснове большасці галасоў было б мэтазгодна, лічыць міністр замежных спраў Германіі Аналена Бербак. Аб гэтым яна заявіла падчас выступлення на адкрыцці сустрэчы кіраўнікоў дыппрадстаўніцтваў замежных дзяржаў у ФРГ, перадае ТАСС.**

Яна заявіла аб намеры працягваць кампанію за ЕС, «скіраваную ў будучыню».

«Ясна адно: калі Еўрасаюз хоча стаць больш устойлівым і прыняць новыя дзяржавы ў свой склад, спатрэбяцца рэформы», — сказала Бербак.

На яе думку, прыняцце рашэнняў на аснове большасці галасоў адыгрывае ў гэтым цэнтральную ролю.

Як адзначыла кіраўнік МЗС Германіі, яна ўхваляе «заснаваны на правілах міжнародны парадак». Яна сцвярджае, што гэта «прыносіць карысць усім», «асабліва малым і слабым».

Раней паведамлялася, што Бербак прадставіла новы план выбудоўвання будучых адносін Еўрапейскага саюза з Расіяй.

Бяспека

# Карта Беларусі амаль уся чырвоная з-за забароны на наведванне лясоў

**Па даных карты забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў, якая знаходзіцца ў вольным доступе на сайце Міністэрства лясной гаспадаркі нашай краіны, практычна на ўсёй тэрыторыі лясных угоддзяў Беларусі заезд у гэтую зону забаронены.**



Строгія абмежаванні ўведзены ў 115 раёнах. Адкрытымі застаюцца толькі тры невялікія пункты. Наведванне лясоў цалкам дазволена ў Браслаўскім, Мядзельскім і Навагрудскім раёнах. Абмежаванне пры наведванні лясоў уведзена таксама і ў Гродзенскім раёне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму спецыялісту аддзела па падрыхтоўцы законапраектаў і ўзаемадзеянні з Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Фіцук Алене Яўгенаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па падрыхтоўцы законапраектаў і ўзаемадзеянні з Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Сініцкай Наталлі Сцяпанаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ПАЭТЫЧНАЯ ДУША ПАЛЕССЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Непадалёк размясцілася часовая экспазіцыя да 140-годдзя класікаў беларускай літаратуры. Супрацоўнікі павільёна, звяртаючыся да мяне, прапаноўваюць... намаляваць Купалу або Коласа. Партрэт, надрукаваны на вялікай паперы, разбіты на мноства фрагментаў. «Трэба закрэсліць фламастарам квадрацік, які вам падабаецца», — тлумачаць мне. Такім чынам, кожны ахвотны можа прыняць удзел у стварэнні агульнага малюнка. І сапраўды, не паспяваю я дафарбаваць свой квадрацік, як да нас падыходзяць падлеткі, якія таксама просяць маркеры. Акрамя гэтага, у павільёне, прысвечаным юбілею песняроў, можна паўдзельнічаць у розных інтэрактыўнасцях: сабраць пазлы з фотаздымкаў Якуба Коласа, пагуляць у настольную гульню і паразгадваць рэбусы.







## ЗВЯЗДОЎСКІЯ «ЗОРКІ»

А я тым часам падыходжу да пляцоўкі Выдавецкага дома «Звязда»: каля яе — дзіцячы натоўп. Здаецца, яшчэ і з-за таго, што выдавецтва прапаноўвае кнігі з прыемнымі зніжкамі:

— На нашых стэндах прадстаўлены як упадабаныя чытачамі выданні, так і навінкі, напрыклад, новая кніга Кацярыны-Хадасевіч Лісавой «Сакрэты аднаго каралеўства». Наша выдавецтва прапануе шырокі спектр літаратуры, пачынаючы з мастацкай і заканчваючы навуковай і асветніцкай. Напрыклад, у нас можна набыць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, — адзначае **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей ЧАРОТА.**

Апроч таго, Выдавецкі дом «Звязда» ладзіць аўтограф-сесіі з аўтарамі. Так, падчас Дня беларускага пісьменства з чытачамі сустрэліся пісьменнікі Іна Фралова, Ірына Карнаухава і Уладзімір Гаўрыловіч. Побач заўважаю **калекцыянера і пісьменніка Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА,** кніга якога «Адзінства непераможнага народа» таксама пабачыла свет у выдавецтве:



— Я прадстаўляю тры ўнікальныя выданні: «Адзінства непераможнага народа», каталог выстаўкі «Бацькаўшчына» ў Нацыянальным гістарычным музеі і кнігу «Тры сястры», у якой сабраны здымкі Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей, некаторыя з якіх друкуюцца ўпершыню. Напрыклад, фота страчаных царквы ў вёсцы Насовічы Добрушскага раёна.

## СЛАВУТАСЦІ ДОБРУША

Дзень беларускага пісьменства — добрая нагода, каб пазнаёміцца з гісторыяй краю. Так, для гасцей свята была арганізавана выстава, якая распавядала аб гісторыі друку Гомеля, а таксама пра фотамайстэрства. У экспазіцыі былі прадстаўлены фотаапараты розных часоў. Дакрануцца да народнага мастацтва дапамагла выстава вырабаў майстроў. Мастакі прэзентавалі мноства прыгожых рэчаў традыцыйнай беларускай культуры: ручнікі, лялькі, вышыванкі.



А з літаратурнай Гомельшчынай удзельнікі пазнаёміліся падчас прэзентацыі найлепшых праектаў бібліятэк краю.

Час ляціць незаўважна, і пакрысе мы набліжаемся да галоўных падзей Дня беларускага пісьменства. У адным з цэнтральных сквераў горада ўзвышаецца пабудова, прыкрытая тканінай. Зусім хутка адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка Івану Шамякіну. Пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Карма, што непадалёк ад Добруша. Для жыхароў горада гэта ганаровая падзея. У невялікім скверыку амаль не прадыхнуць: усім цікава ўбачыць, які жа будзе помнік народнаму пісьменніку. «Я прачытаў усяго Шамякіна», — распавядае мне пажылы дабрушанін.

Скіроўваем увагу на скульптурную кампазіцыю: тканіна злятае, і



мы бачым задумлівага чалавека з кнігай у руках. Удзел у адкрыцці помніка прыняла дачка пісьменніка Алеся Шамякіна, яна адзначыла, што работа скульптараў Уладзіміра Піпіна і Канстанціна Касцючэнкі ўдалася.

## ТОЕ, ШТО НАТХНЯЕ

Увесь дзень падчас свята ў горадзе было сонечна, надвор'е стаяла амаль летняе. Але вечарам адчувалася, што прыйшла восень. Людзі, хутаючыся ў паліто ды курткі, спяшаліся да галоўнай сцэны...

Пачынаецца ўрачыстае адкрыццё XXIX Дня беларускага пісьменства. **Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** агучыў віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у якім кіраўнік краіны адзначыў, што менавіта пісьменства з'ядноўвае мінулае, цяперашняе і будучыню, зберагаючы як найвялікшы скарб сувязь пакаленняў.

Да гасцей урачыстага адкрыцця звярнуўся **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ:**

— Амаль тры дзесяцігоддзі Дзень беларускага пісьменства з'яўляецца адным з важных свят на тэрыторыі суверэннай Беларусі. Пісьменства, літаратура, кніга ў жыцці нашага народа былі і застаюцца сродкам спазнання свету, спосабам выхавання асобы, развіцця духоўных каштоўнасцяў. Паэзія і проза беларускіх класікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і вашага земляка, народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна і цяпер з'яўляюцца крыніцай гонару і творчага натхнення. Нашы продкі пакінулі нам гераічную гісторыю, якую мы павінны не толькі памятаць, але і захоўваць. Гэта яскрава дэманструецца на сённяшнім свяце ў Добрушы, якое праводзіцца ў Год гістарычнай памяці. Шчыра жадаю ўсім удзельнікам і гасцям цікавых знаёмстваў, нечаканых адкрыццяў, якія будуць садзейнічаць больш глыбокаму спазнанню гісторыі і культуры нашай роднай Беларусі.

Увечары канцэртная пляцоўка выглядае відовішчна: усё зіхаціць чырвона-аранжавымі агеньчыкамі. У сюжэтнай лініі канцэрта арганізатары свята спалучылі адразу некалькі тэм: Год гістарычнай памяці, традыцыі Добруша і распавед аб класіках і сучасніках айчыннай літаратуры. З музычным суправаджэннем Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь на добрушскай сцэне выступілі заслужаныя артысткі Ірына Дарафеева і Алена Ланская, артысты Тэа і Вольга Рыжыкава. У выкананні ансамбля «Бяседа» і Нацыянальнага акадэмічнага хору імя Цітовіча прагучалі фальклорныя спевы. А вось за сучаснасць адказваў гурт «Дразды» — гасцям вельмі спадабалася песня пра сланечнікі. Прыемным сюрпрызам стала з'яўленне на сцэне любімых з дзяцінства герояў «Калыханкі» — мядзведзіка Топы і Бусліка. Фінальным акордам канцэрта было выступленне народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі. Першы святочны дзень завяршыўся феерверкам.



**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БелТА**
**і Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**

# Будзем знаёмыя!

Чым адметныя кнігі-лаўрэаты
Нацыянальнай літаратурнай прэміі — 2022

### «ЛЕПШЫ ТВОР (ЗБОРНІК ТВОРАЎ) ПАЭЗІІ»

**Алесь Бадак. *«Уладар ветру»*.** *Выдавецкі дом «Звязда».*




У кнізе прадстаўлены найлепшыя вершы вядомага паэта за ўсе гады яго творчасці, пачынаючы ад зборніка «Будзень», які пабачыў свет у 1989 годзе, і да раздзела «З пачатай кнігі», дзе змешчаны новыя творы. Лірычны герой — летуценнік, філосаф, беларус, які шчыра любіць сваю радзіму. У зборнік уключана паэма «Ра», якая ў сімвалічнай форме апісвае пакутлівы шлях чалавека да асэнсавання сваёй прыналежнасці роднай зямлі, таго, што толькі яна можа стаць галоўным арыенцірам у пошуках сябе. Тэма гістарычнай памяці, нялёгкага лёсу роднай мовы абвострана раскрываецца і ў гэтай паэме, і ў іншых творах зборніка.




### «ЛЕПШЫ ТВОР ПРОЗЫ»

**Мікалай Чаргінец. *«А он не вернулся из боя»*.** *Выдавецкі дом «Звязда».*

Новы раман народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца працягвае раскрываць традыцыйную для аўтара тэму — чалавек і вайна. У аснове — рэальныя падзеі: лёс аднаго з савецкіх воінаў, якія ваявалі ў Афганістане. Галоўны герой, беларус, трапляе ў палон і шмат гадоў адарваны ад роднай зямлі, ад сваёй сям'і. Чытач бачыць экзатычныя месцы — ахоплены вайной Афганістан, пакістанскую турму, нават саваны Зімбабвэ. Паралельна даецца панарама таго, што адбываецца на радзіме галоўнага героя: развал Савецкага Саюза, галодныя 1990-я, станаўленне незалежнай Беларусі.

### «ДРАМАТУРГІЯ»

**Анатоль Андрэеў. *«Главные слова для любимой женщины»*.** *«Колорград».*




Намінацыя «Драматургія» заўсёды самая складаная, бо не кожны год знаходзіліся годныя кандыдаты на перамогу — п'есы асобнымі выданнямі выдаюцца досыць рэдка. Мінулым разам прэмія ў гэтай намінацыі не ўручалася. Сёлета яе атрымаў аўтар рускамоўнага трагікакамедыйнага зборніка Анатоль Андрэеў. Галоўная тэма яго п'ес, займальных, павучальных і нескладаных для пастаноўкі, — адносіны паміж мужчынам і жанчынай, сямейныя перыпетыі, тое, што зразумела ва ўсе часы. Нездарма асноўны жанр змешчаных у зборніку твораў — фарс.




### «ЛЕПШЫ ТВОР ПУБЛІЦЫСТЫКІ»

**Андрэй Мукавозчык. *«Революция мокрых штанов»*.** *«Беларусь».*

Гэта рэзананснае выданне, у якое ўвайшлі публіцыстычныя матэрыялы аўтарскай рубрыкі «Накіпела» аглядальніка газеты «СБ. Беларусь сегодня» Андрэя Мукавозчыка. Рэфлексіі аўтара на нядаўнія палітычныя падзеі вострыя, неабыякавыя, часта саркастычныя. Прыводзіцца шмат фактаў і цытат. Як сцвярджае сам Андрэй Мукавозчык, атрымалася хроніка 2020 года, «сур'ёзны гадавы зрэз». Кніга праілюстравана мастаком газеты «СБ. Беларусь сегодня» Алегам Карповічам, чые малюнкі суправаджалі і кожны выпуск рубрыкі Андрэя Мукавозчыка.

### «ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»

**Ігар Запрудскі. *«Беларуская літаратура і культура XIX стагоддзя: асаблівасці развіцця і актуальныя пытанні даследавання»*.** *Выдавецтва БДУ.*



Вядомы літаратуразнаўца ўзяўся за нялёгкую і пачэсную задачу: стварыць панараму беларускай літаратуры той эпохі, калі яна не мела магчымасці развівацца напоўніцу, а пасля многія імёны замоўчваліся ці выклікалі спрэчкі аб культурнай прыналежнасці. Даследчык даказвае, што на Беларусі заўсёды нараджаліся таленавітыя творцы, іх плён варты ўвагі і памяці. Манаграфія запаўняе белыя плямы айчыннай гісторыі, ажыўляе постаці беларускага мінулага.




### «ЛЕПШЫ ТВОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА»

**Алесь Жук. *«Лаві зайца!»*** *Выдавецкі дом «Звязда».*

Вядомы беларускі пісьменнік Алесь Жук у творах для маленькіх чытачоў застаецца філосафам і майстрам мастацкага вобраза. Пры гэтым яго апавяданні вельмі чытэльныя і зразумелыя дзецям. Яны адкрываюць сучаснаму дзіцяці таемны і бясконцы свет беларускай прыроды, вучаць правільнаму стаўленню да ўсяго жывога, а таксама прышчапляюць павагу да працы, паказваюць, якімі побытавымі навыкамі мусіць валодаць чалавек. Чытаючы кнігу, можна нібыта гартаць каляндар прыроды, адначасова атрымліваць карысныя жыццёвыя парады і паглыбляць веды па беларускай мове.

### «ЛЕПШЫ ДЭБЮТ»

**Валерыя Сцяцко. *«Нязломны. Аляксей Талай»*.** *Выдавецкі дом «Звязда».*




Журналістка Выдавецкага дома «Звязда» Валерыя Сцяцко, безумоўна, прапусціла нялёгкі лёс свайго героя праз сэрца — чытаць яе кнігу і застацца абыякавым немагчыма. Хлопчык, які ў шаснаццаць гадоў падарваўся на міне, што засталася з вайны, страціў рукі і ногі, але не здаўся — сапраўдны герой нашага часу. Сёння Аляксей Талай — паралімпійскі чэмпіён, спартыўны і грамадскі дзеяч, бізнесмен, шчаслівы муж і бацька чацвярых дзяцей. Як ён гэтага дасягнуў, аўтар кнігі раскрывае праз шматлікія сведчанні блізкіх, сяброў і знаёмых свайго героя.

**Падрыхтавала Людміла ПЯТРОВА.**

# Новае сузор'е Нацыянальнай літаратурнай прэміі

**Падчас урачыстага адкрыцця XXIX Дня беларускага пісьменства адной з галоўных падзей стала ўзнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія». У гэтым годзе лаўрэатаў вызначылі ў сямі намінацыях. Адразу чатыры аўтары, кнігі якіх пабачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда», атрымалі ганаровыя ўзнагароды.**



Звяртаючыся да пераможцаў, **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— Для мяне асабіста падзея ўручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі з'яўляецца сакральнай. Гэта свята для многіх літаратараў краіны. Гэтае свята ў шэрагу тых дзяржаўных творчых праектаў, якія звязаны з ацэнкай мастакоў слова, сцэны, пэндзля і кіно. Я віншую тых, хто сёння падымецца на гэтую сцэну і атрымае заслужаныя ўзнагароды, якія вызначыла кампетэнтнае журы і эксперты на дзяржаўнай і творчай пляцоўцы Міністэрства інфармацыі нашай краіны.

Узнагароду ў намінацыі «Лепшы твор. Зборнік твораў паэзіі» атрымаў Алесь Бадак за зборнік «Уладар ветру». Пераможцам у намінацыі «Лепшы твор прозы» стаў народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец з кнігай «А он не вернулся из боя». Лепшым творам драматургіі прызналі зборнік Анатоля Андрэева «Главные слова для любимой женщины». Узнагароду за найлепшы твор публіцыстыкі атрымаў Андрэй Мукавозчык за зборнік «Революция мокрых штанов». Лепшым творам літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства прызналі кнігу Ігара Запрудскага «Беларуская літаратура і культура XIX стагоддзя: асаблівасці развіцця і актуальныя пытанні даследавання». Узнагароду за лепшы твор для дзяцей і юнацтва атрымаў Алесь Жук за кнігу «Лаві зайца!». Пераможцай у намінацыі «Лепшы дэбют» стала Валерыя Сцяцко за кнігу «Нязломны. Аляксей Талай».

**Народны пісьменнік Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** павіншаваў лаўрэатаў і гасцей свята:

— Вялікі дзякуй жыхарам Добруша — вы зрабілі ваш горад яшчэ прыгажэйшым. Я хачу падзякаваць нашай роднай Беларусі, нашаму народу і Прэзідэнту. Мяркую, надышоў час сказаць: мы становімся багацейшыя душэўна, папаўняюцца нашы веды і ўменні па любым напрамку. Я выказваю шчырую падзяку арганізатарам гэтага вялікага свята, у тым ліку кіраўніцтву Міністэрства інфармацыі. Віншую вас, свята атрымалася.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Ведай нашых!

# «Дэбют бывае раз у жыцці»

## Журналістка «Звязды» Валерыя СЦЯЦКО — лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі

**Для кожнага пісьменніка атрымаць літаратурную прэмію — знакавая падзея. Але эмоцыі, калі ты становішся лаўрэатам у намінацыі «Дэбют», немагчыма параўнаць з іншымі. Сёлета Валерыя Сцяцко стала самым маладым аўтарам, чыя кніга атрымала высокую ўзнагароду. Працуючы над выданнем «Аляксей Талай: нязломны», Валерыя правяла шмат часу не толькі з галоўным героем, але і з яго сям'ёй, разам з Аляксеем журналістка наведала розныя гарады нашай краіны. Напружаная праца дала вынік — тыраж кнігі разышоўся. Як распавяла сама аўтар, у яе асабіста засталося ўсяго некалькі экзэмпляраў. Валерыя падзялілася са «Звяздой» уражаннямі ад Дня беларускага пісьменства і падзякавала ўсім, хто меў дачыненне да стварэння кнігі.**



— Мяне вельмі ўразіла, што на Дні беларускага пісьменства, калі мы гулялі па пляцоўках Добруша, было шмат моладзі: сем'і з дзеткамі, сяброўскія кампаніі. Яны цікавіліся не толькі кніжнай прадукцыяй, але і вырабамі майстроў, канцэртнай праграмай. Людзі пазнаёміліся з беларускай культурай і выдатна правялі свае выхадныя. Мне здаецца, ідэя праводзіць свята менавіта ў такіх невялікіх гарадах — гэта добра. Многія з жыхароў адзначалі, што такога вялікага свята ў іх горадзе не было даўно. Было відаць, што Добруш жыў Днём беларускага пісьменства, да яго вельмі актыўна рыхтаваліся і шчыра сустракалі гасцей.

Для мяне стала нечаканасцю, што я стану лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Мне ўвогуле было важна, каб кніга выйшла. Але кнігу заўважылі і адзначылі. Значыць, гэта паказчык таго, што яна цікавая і патрэбная. Учора мяне павіншаваў Аляксей Талай, і мы з ім сышліся на думцы, што, калі выданне адзначылі такой прэміяй, значыць, мы сапраўды зрабілі вялікую справу. Я спадзяюся, што чытачам яна таксама спадабалася. Канешне, прыемна, калі тваю першую кнігу ацэньваюць так высока, адчуваеш вялікую адказнасць. Спадзяюся, у мяне будуць і іншыя кнігі. Трэба, каб яны атрымаліся не горшымі, а можа, нават і лепшымі. Таму што пераможца Нацыянальнай літаратурнай прэміі не можа напісаць дрэнную і нецікавую кнігу. Я вельмі ўдзячна ўсім, хто адзначыў мяне такой высокай узнагародай, а таксама тым, хто падтрымліваў і дапамагаў у рабочым працэсе. Спартсмены, з якімі я працую, часта кажуць: «Гэта не толькі мой асабісты медаль — гэта таксама перамога трэнерскага штаба». Так і з прэміяй: гэта не толькі мая заслуга, але і ўсіх, хто меў да яе дачыненне. Вядома, я вельмі ўдзячна свайму герою — Аляксею Талаю. Не спыняемся на дасягнутым і ідзём далей. Але дэбют бывае адзін раз у жыцці, таму прэмія сапраўды адметная і значная.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**

# СМАК ДА ЛІТАРАТУРЫ

## Свята ў Добрушы сціхла, а гонар застаўся

**Нездарма старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО сярод слоў падзякі арганізатарам Дня беларускага пісьменства нізкі паклон адрасаваў менавіта майстрам слова. Пра ролю апошняга ў развіцці сучаснага беларускага грамадства шмат казалі падчас рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Добрушскія чытанні».**

### Падарунак навукоўцаў

Ад імя кіраўніцтва Гомельскай вобласці ўдзельнікаў даследчага форуму прывітаў **намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ.** Ён падкрэсліў, што ў рэгіёне ўдзяляецца значная ўвага захаванню культуры і духоўнасці беларускага народа:

— За апошнія пяць гадоў у рэгіёне шасці традыцыям і абрадам нададзены статус гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Аднаўляюцца архітэктурныя ансамблі, увекавечваецца памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, ідзе актыўнае ўзаемадзеянне з пісьменнікамі, вынікам якога стала ўручэнне ўнікальнай для краіны абласной літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага.

**Старшыня Добрушскага райвыканкама Аляксандр МАТАРАС** нагадаў, што Добрушскі край славіцца вядомымі пісьменнікамі, навукоўцамі, культурнымі дзеячамі, якія ўнеслі значны ўклад у жыццё нашай краіны.

На рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай Дню беларускага пісьменства і Году гістарычнай памяці, даклад пра невядомыя старонкі жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры, заснаваны на ўнікальных матэрыялах даваенных дзённікаў Шамякіна, прадставілі нашчадкі пісьменніка — дачка Алеся Іванаўна Шамякіна і ўнукі — Іван Сяргеевіч і Славяна Вячаславаўна.

— Сёлета свята праходзіць пад знакам Года гістарычнай памяці — падмурка, без якога немагчыма пабудаваць будучыню. Для любога грамадства важна захаваць і перадаць нашчадкам перажыты вопыт і назапашаныя каштоўнасці, стаўленне да сваіх герояў, агульных свят і цяжкіх часоў, захоўваць гістарычную памяць, быць патрыётам, асобай, якая ўмее арыентавацца ў зменлівым сучасным свеце, рабіць правільны выбар, — звярнуўся да ўдзельнікаў навукова-даследчага форуму **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ігар КАПЫЛОЎ.**

Ён адзначыў, што на «Добрушскіх чытаннях» прадстаўлены ў тым ліку самыя разнастайныя работы вядучых навукоўцаў краіны па даследаванні рэгіянальнай культуры Добрушскага краю: асаблівасці мясцовых гаворак і назваў вуліц, культурны код у аснове прозвішчаў жыхароў раёна, даследаванне спецыфікі архітэктуры.

Таксама ўпершыню на малой радзіме Івана Шамякіна былі прэзентаваны вынік складанай, грунтоўнай работы супрацоўнікаў Акадэміі навук Беларусі па выданні 23-томнага збору твораў народнага пісьменніка Беларусі.

— Выданне ўключае не толькі мастацкія творы, але і каментарыі, рукапісныя знаходкі, вынікі вельмі вялікай працы з архівамі, з рукапіснай спадчынай, — падзяліўся Ігар Капылоў.

На канферэнцыі прагучалі даклады аб унікальных даследаваннях, заснаваных на матэрыялах экспедыцыі па Добрушскім краі навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ. Гэта даследаванне вясельнай абраднасці Добрушчыны, даследаванне чалавека і свету ва ўяўленнях жыхароў раёна, перададзеных праз жывыя інтэрв'ю з носьбітамі мясцовай культуры.

### Пяцёрка найлепшых

З галоўнай святочнай сцэны Дня беларускага пісьменства ў Добрушы былі названы імёны пяці лаўрэатаў абласной літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага. Дыпломы пераможцам уручыў старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко.

Уладальніцай прэміі ў намінацыі «Паэзія» за зборнік «Жыццё жыццейка» стала Ніна Нікіціна — знакамітая паэтэса Гомельшчыны, вядомая пад літаратурным псеўданімам Ніна Шклярава. У намінацыі «Дзіцячая літаратура» пераможцам прызнаны Яўген Калашнікаў. Тамара Кручэнка ўшанавана ў намінацыі «Публіцыстыка і літаратурная крытыка». У намінацыі «Адкрыццё года» за літаратурны твор «Испытание временем» прэмія прысуджана Жанэце Сычовай. Новы твор **старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра ГАЎРЫЛОВІЧА** «Там, дзе цячэ Пуць-рака», у якім падзеі сучаснасці пераплятаюцца з жыццём старажытнага Турава, Кіева і Кракава, прызнаны найлепшым у намінацыі «Проза».

— Свята «Дзень беларускага пісьменства» — сведчанне таго, што мы ёсць нацыя, самабытны народ, што ёсць глыбокія карані, які дазволілі нам прайсці многія выпрабаванні і захаваць сваю ідэнтычнасць, культуру, — падзяліўся Уладзімір Гаўрыловіч. — Перакананы, што Дзень беларускага пісьменства дайшоў да таго часу, калі ён павінен адначасова стаць і Днём прафесійнага свята пісьменнікаў.

### «Хвала рукам, што пахнуць хлебам»

Падчас святкавання Дня пісьменства ў Добрушы прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага творчага конкурсу сярод журналістаў СМІ на тэму ўборачнай кампаніі «Хвала рукам, што пахнуць хлебам».

Прэміі журналістам уручыў міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў. Ён выказаў спадзяванне, што конкурс стане добрай традыцыяй Дня беларускага пісьменства, як даніна павагі чалавека працы, які стварае харчовую бяспеку нашай краіны. На конкурс паступіла 129 заявак, у тым ліку сем ад рэспубліканскіх СМІ і 68 — рэгіянальных. Усяго за званне пераможцаў у розных намінацыях змагаліся прадстаўнікі 75 рэдакцый, на суд журы было пададзена 470 журналісцкіх работ.

### Месца памяці

У Добрушы ганаровыя госці і ўдзельнікі Дня беларускага пісьменства ўсклалі кветкі і вянкі да брацкай магілы і мемарыяльнага комплексу «Памяць» на набярэжнай ракі Іпуць, дзе пахаваны 26 воінаў, загінулых у кастрычніку 1943 года пры вызваленні Добруша ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На мемарыяле, устаноўленым у 2005 годзе, таксама ўшанавана памяць аб амаль 900 жыхарах Добрушскага раёна, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адначасова былі ўскладзены кветкі да 48 брацкіх, адзіночных воінскіх пахаванняў і магіл мірных жыхароў — ахвяр фашызму на тэрыторыі ўсяго Добрушскага раёна. Каля набярэжнай у цэнтры Добруша прайшла ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Добруш партызанскі».

### Літаратурныя атракцыёны

Супрацоўнікі бібліятэк з самых розных куткоў Гомельшчыны сустракалі гасцей свята на літаратурных падворках. Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя Леніна арганізавала літаратурны салон Паскевічаў.

— Галоўная тэма салона — раман Льва Талстога «Вайна і мір», бо менавіта Ірына Паскевіч першай зрабіла пераклад гэтага твора на французскую мову, пасля чаго адзін з самых знакавых для Расіі раман стаў папулярны за мяжой, — звярнула ўвагу **загадчыца агульнай чытальнай залы Таццяна РАБІКАВА.** — Падрыхтавалі гульню ў шарады, більбокі і бірулькі — папулярныя ў XIX стагоддзі. Акрамя таго, сваім гасцям мы прапанавалі ўжыцца ў вобразы герояў «Вайны і міру» і прачытаць дыялогі з рамана.

Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя Леніна на свяце прэзентавала таксама выставачны праект літаратурнага музея «Пісьменнікі Гомельшчыны», які расказвае пра Івана Мележа, Андрэя Макаёнка, Івана Навуменку і Івана Шамякіна. Тут прадстаўлены ўнікальныя экспанаты, перададзеныя ў фонд музея роднымі і сваякамі мастакоў слова.



Літаратурны салон Ірыны ПАСКЕВІЧ Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна.

Дарэчы, жыццю і творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна прысвечаны асобны праект.

— Большасць матэрыялаў для экспазіцыі ўзятыя з фондаў нашай бібліятэкі. Многія дакументы перададзены дачкой Івана Пятровіча Шамякіна Алесяй Іванаўнай. Дзякуючы гэтаму студэнты, школьнікі маюць магчымасць стаць сённяшнімі ўдзельнікамі творчай лабараторыі пры музеі «Пісьменнікі Гомельшчыны», паўдзельнічаць у інтэрактыўных занятках, дэкадах беларускай літаратуры, — тлумачыць **бібліятэкар Ніна СЕРЫКАВА.**

Да Дня беларускага пісьменства бібліятэкары падрыхтавалі тэст па фактах з жыцця і дзейнасці пісьменніка. Задача інтэрактыву — не «падлавіць» на няведанні пэўнай інфармацыі, а разам даznацца аб цікавых звестках.

— Для многіх адкрыццё, што ўжо ў савецкі час усе кнігі Івана Шамякіна былі больш за ўсё перакладзены на кітайскую мову. Расказваем і наколькі велізарная літаратурная спадчына нашага земляка: 125 кніг 30-мільённым тыражом выдадзеныя на 30 мовах свету, — расказала Ніна Серыкава. — Цікава нашым гасцям даведацца, які твор першым напісаў Іван Пятровіч. Мала хто ведае, што гэта «У снежнай пустыні»: будучы класік тады служыў палітруком у войску, напісаў на палях руска-фінскага слоўніка. Пасля народны пісьменнік успамінаў, што за тую творчасць атрымаў некалькі пазачарговых нарадаў, якія добрасумленна вытрымаў. Але згадваў менавіта той час, калі паперы не было, а вельмі хацелася пісаць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**

---

Меркаванні

# Несці веру, любоў і надзею

**Удзельнікі і госці свята падзяліліся са «Звяздой» добрым настроем, а таксама распавялі аб галоўных мерапрыемствах, якія адбываліся на вуліцах горада. Сярод іх — літаратурныя імпрэзы ад сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі, святкаванне 100-гадовага юбілею часопіса «Полымя», прэзентацыя новага выдання з серыі «Беларусь літаратурная», а таксама рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка».**

***Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:***

— 16 тысяч дзяцей прынялі ўдзел у чытаннях, прысвечаных Дню беларускага пісьменства. Вельмі важна, што сувязь пакаленняў жывая і перадаецца, ёсць новыя добрыя творы, працягваюцца найлепшыя традыцыі пісьменства. Толькі за гэты год ад папярэдняга Дня беларускага пісьменства на конкурс было выстаўлена 68 твораў. Гэта сведчанне таго, што ў нас ёсць таленты, і дзяржава іх сапраўды падтрымлівае, стымулюе пісьменніцкую супольнасць, дапамагае выдаваць кнігі, сустракацца з моладдзю.

***Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:***

— Дзякуючы пісьменству захоўвалася радавая і гістарычная памяць, фарміравалася духоўна-культурная спадчына і традыцыі — іншымі словамі, усё тое, што вызначае найлепшыя асаблівасці душы беларусаў. Найвышэйшае прызначэнне пісьменства — несці веру, любоў і надзею з дапамогай Госпада Ісуса Хрыста. Слова, як імя Бога, павінна аб'ядноўваць грамадства, умацоўваць яго свядомасць.

***Віктар ШНІП, паэт, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя»:***

— Да Дня беларускага пісьменства выдавецтва «Мастацкая літаратура» кожны год у серыі «Беларусь літаратурная» выдае кнігі, прысвечаныя літаратурнай спадчыне краю, дзе адбываецца свята. У гэтым годзе кніжка незвычайная: калі раней мы прадстаўлялі толькі адзін раён, то ў новым выданні адлюстравана ўся літаратурная Беларусь. Кніжка, зразумела, адкрываецца Гомельшчынай — там прысутнічаюць аўтары, якія нарадзіліся ў Добрушскім раёне. Для многіх з аўтараў гэта першая публікацыя ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Такім чынам, атрымалася своеасаблівая анталогія рэгіёнаў.

Само свята непаўторнае, бо кожная яго сталіца мае сваю гісторыю, адметнасці. Нейк звычайна атрымліваецца, што нам шанцуе з надвор'ем: заўсёды сонечна. Магчыма, ад таго, што людзі сабраліся разам і ад іх усмешак сонца не можа хавацца за аблокі. Дзякуючы такім святам мы, літаратары, маем магчымасць сустрэцца адно з адным і з чытачамі. Самае галоўнае, што свята было, ёсць і мае працяг.

***Алесь БАДАК, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:***

— У наш новы том «Беларусь літаратурная» ўвайшлі творы 90 аўтараў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Мы звярнуліся да старшынь абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кніжка атрымалася ўнікальная, бо дагэтуль усе абласныя аддзяленні не былі прадстаўлены ў такім аб'ёме. Выданне дапамагае ўбачыць не толькі творчасць канкрэтнага пісьменніка, а прэзентуе ўсю літаратурную Беларусь, наколькі яна багатая і разнастайная.

Я стаяў каля нашага павільёна і ўбачыў незнаёмага чалавека — ён сеў на крэсла і хвілін 20 чытаў кнігу, якую выдала «Мастацкая літаратура». Я падумаў, што павільён у нейкім сэнсе замяніў яму бібліятэку, — чалавек адкрыў для сябе новага аўтара. Я не хачу яго адрываць, таму што калі хтось чытае, ён жыве ў сваім свеце. Такое адкрыццё чытачамі новых цікавых беларускіх аўтараў — адзін з выдатных вынікаў свята.

***Алена СТЭЛЬМАХ, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі:***

— Літаратурныя праграмы сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі звязаны з інтанацыяй самога свята, яны прысвечаны Году гістарычнай памяці, нашым продкам і караням, сувязі пакаленняў і важнасці пераймання вопыту. У Добруш прыехалі пісьменнікі з кожнага куточка нашай краіны, каб паказаць свае творчыя набыткі. Для сяброў саюза вялікі гонар, што ў сталіцы Дня беларускага пісьменства яны маюць магчымасць падзяліцца сваёй творчасцю.

**Арына КАРПОВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение

## «Минскстрой»

доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений и дополнений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений и машино-мест в составе объекта

**«Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилые дома № 24а, 24б по генплану. Очередь строительства 5.1. Жилой дом № 24а по генплану, гараж-стоянка 24а-1 по генплану,**

*опубликованную в газете «Звязда» от 27.08.2021 № 164 (29533) в редакции извещений о внесении изменений и дополнений от 15.09.2021 № 177 (29546), от 07.10.2021 № 193 (29562), от 27.05.2022 № 102 (29724), от 21.07.2022 № 141 (29763) и от 06.08.2022 № 153 (29775)*

**Объект долевого строительства – квартира с машино-местом.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации**

Срок начала строительства объекта – 30 июля 2021 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 23 месяца.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектом организации строительства – 29 июня 2023 года.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров на коммерческой основе:**

**36 (тридцать шесть) однокомнатных квартир** с выполнением внутренних черновых отделочных работ с учетом приобретения **машино-места в гараже-стоянке 24а-1 по генплану** в составе объекта строительства, в том числе:

№ 93, 128, 133, 138, 143, 286, 311 (общая площадь 40,27 кв. м);

№ 99, 104, 114, 119, 139, 183, 198, 218, 287, 292, 297, 307, 312, (общая площадь 40,84 кв. м);

№ 115, 120, 135, 140, 145, 268, 278, 293, 298, 308 (общая площадь 43,35 кв. м);

№ 26, 42, 46 (общая площадь 48,48 кв. м);

№ 45, 53, 57 (общая площадь 49,54 кв. м).

**4 (четыре) трехкомнатные квартиры** с выполнением внутренних черновых отделочных работ с учетом приобретения **машино-места в гараже-стоянке 24а-1 по генплану** в составе объекта строительства, в том числе:

№ 111 (общая площадь 90,31 кв. м);

№ 116 (общая площадь 90,31 кв. м);

№ 175 (общая площадь 88,75 кв. м);

№ 249 (общая площадь 88,89 кв. м).

**Цены на объекты долевого строительства**

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади жилых помещений с выполнением внутренних черновых отделочных работ в текущих ценах для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в том числе индивидуальных предпринимателей и (или) юридических лиц составляет:

**для однокомнатных квартир:**

- 3 090,00 белорусских рублей при условии оплаты согласно графику платежей;
- 2 900,00 белорусских рублей при 100 % оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства;
- 3 150,00 белорусских рублей при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ;

**для трехкомнатных квартир:**

- 2 850,00 белорусских рублей при условии оплаты согласно графику платежей;
- 2 750,00 белорусских рублей при 100 % оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства;
- 2 990,00 белорусских рублей при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ.

Стоимость машино-места составляет **23 395,76** белорусского рубля.

**Условия оплаты:**

При условии оплаты согласно графику платежей к договору создания объектов долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению и машино-месту составляет 50 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей к договору. Оплата первоначального взноса либо 100 % оплата по жилому помещению и машино-месту должны быть произведены дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

При кредитовании в рамках партнерских кредитных программ финансирования строительства размер первоначального взноса по жилому помещению составляет 10 % от стоимости жилого помещения. Оставшаяся сумма по договору оплачивается в соответствии с графиком платежей к договору. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Заявления о включении в долевое строительство будут приниматься (регистрироваться) в порядке живой очереди через 5 календарных дней, а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящего извещения по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 (режим работы: пн.–чт. – 8.30 до 17.45, пт. – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00 – 14.00, тел.: 8-017-327-52-36, 226-03-01, 8 029 195-18-21) непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта либо доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: документа, подтверждающего полномочия представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

ГПО «Минскстрой» информирует об отмене декларации в части продажи 7 (семи) однокомнатных квартир на коммерческой основе с выполнением внутренних черновых отделочных работ с учетом приобретения машино-места в гараж-стоянке 24а-1 по генплану в составе объекта строительства, в том числе:

№ 93, 128, 246, 286 (общая площадь 40,27 кв. м);

№ 198, 287 (общая площадь 40,84 кв. м);

№ 18 (общая площадь 48,48 кв. м).

З нагоды

# ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ПА-ЛЕПЕЛЬСКУ

**Горад Лепель, што ў Віцебскай вобласці, урачыста адзначыў 583-годдзе. Да Дня горада прымеркавалі адкрыццё шэрагу сацыяльна значных аб'ектаў.**



Першая летапісная згадка аб ім датуецца 1439 годам. Тады Лепель стаяў на найважнейшым гандлёвым шляху старажытнасці «з вараг у грэкі». Сёння гэта багаты горад на поўначы Віцебшчыны не толькі з маляўнічымі прыроднымі краявідамі, а яшчэ і адметным міфалагічным фестывалем «Шлях цмока», які прываблівае турыстаў.

Напярэдадні свята, 2 верасня, у горадзе адбылося адкрыццё Цэнтра сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі, навучання, пражывання інвалідаў і часовага прытулку з удзелам кіраўніцтва паўночнага рэгіёна. У новым будынку створаны ўсе ўмовы для камфортнага адначасовага пражывання шасці чалавек: гасцёўня з тэрасай, кухня, спальныя і «крызісны» пакоі. Наведвальнікі Цэнтра сацыяльна-працоўнай, бытавой і фізічнай рэабілітацыі Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, які вядзе свой адлік з 2018 года, займаюцца садаводствам і пякуць хлебабулачныя вырабы, пасля навучання могуць атрымаць спецыяльнасць афіцыянта або прадаўца-касіра.



Да Года гістарычнай памяці і 583-годдзя Лепеля было прымеркавана адкрыццё адрэстаўраванага помніка савецкім воінам-вызваліцелям і партызанам у скверы на плошчы Свабоды. Тут пахаваны салдаты і партызаны з Кіраўскай, Яраслаўскай, Смаленскай, Разанскай абласцей Расіі, якія загінулі пры вызваленні Лепельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Побач з імі знайшлі свой вечны спачын Герой Савецкага Саюза — камандзір партызанскай брыгады «Алексея» Аляксей Данукалаў, камандзір партызанскай брыгады імя Сталіна Дзмітрый Караленка, камандзір 2-га атрада партызанскай брыгады «Дубава» Анатоль Марунька. Па словах старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева, у рэгіёне праводзіцца вялікая работа па добраўпарадкаванні і рэстаўрацыі брацкіх пахаванняў і мемарыяльных комплексаў.

У суботу старт урачыстым мерапрыемствам дало адкрыццё новага футбольнага поля на тэрыторыі гімназіі імя І. М. Ерашова горада Лепеля, якое стала сапраўдным падарункам для юных аматараў гульні з мячом. Яго пабудавалі на месцы старога поля за сродкі раённага бюджэту і Беларускай федэрацыі футбола. Як расказаў дырэктар Лепельскага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Сяргей Буйніцкі, зараз у раёне футбол з'яўляецца адным з самых папулярных відаў спорту, ім у групах падрыхтоўкі прафесійна займаюцца каля 300 хлопчыкаў. У планах на наступны год — запуск пілотнага праекта, дзе школьнікі будуць трэніравацца афіцыйна ў шосты школьны дзень.

Па адной з галоўных гарадскіх вуліц святочным шэсцем прайшлі прадстаўнікі працоўных калектываў, арганізацый, устаноў культуры, адукацыі і спорту. У гэты дзень лепельскія вуліцы і пляцоўкі пераўтварыліся ў стракатыя рады, запрашаючы жыхароў і гасцей на інтэрактыўныя гульні, выставы і імпрэзы. Падворкі сельскіх Саветаў здзіўлялі «ўраджайным» афармленнем і адмысловымі стравамі. На плошчы Свабоды ўсіх ахвотных запрашала выстава ваеннай тэхнікі і стралковай зброі, а гарадскі парк напоўніўся маладзёжнымі рытмамі: тут працавалі музычная пляцоўка «Lepel open air», выстава «З бабулінай скрыні», а лепельскія гаспадыні змагаліся ў конкурсе «Клёцкі па-лепельску». Яркім святочным акордам стала барабаннае шоу віцебскага гурта BARABAND і фестываль фарбаў.

На сцэне Летняга гарадскога амфітэатра прайшла цырымонія ўзнагароджання заслужаных работнікаў раёна, пераможцаў конкурсу па добраўпарадкаванні тэрыторый і выпускнікоў-стабальнікаў. Падчас канцэртнай праграмы "Табе, мой Лепель, прызнаюся ў любові" гучалі шчырыя музычныя кампазіцыі ад вядучых мастацкіх калектываў Лепельшчыны, а вечарам на хіты 1980-х запрашала дыскатэчная пляцоўка пад адкрытым небам.

Нотку цуду ў святочны вечар унесла шоу шароў, якія свецяцца. Каляровай вясёлкай над горадам зазззялі агні салютаў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота з тэлеграм-каналаў «Віцебская вобласць. Афіцыйна» і «Лепельскі раён. Афіцыйна».**

На слыху

# Сумняваешся ў падарунку — не бяры яго

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю рэкамендуе адмаўляцца ад атрымання сумнеўных падарункаў ад невядомых па пошце, паведаміла прэсслужба міністэрства.**

«Апошнім часам пачасціліся выпадкі, калі па тэлефоне прадстаўнікі якой-небудзь крамы паведамляюць, што па выніках праведзенай акцыі спажыўцу належыць падарунак — дарагі мабільны тэлефон ці іншы каштоўны тавар. І атрымаць яго можна на пошце, аплаціўшы кошт паштовых паслуг і паслуг адпраўніка (аплата паштовай тары, упакоўкі падарунка і г. д.), якая складае, напрыклад, 45 ці 50 рублёў.

Пасля выказвання па тэлефоне згоды на атрыманне падарунка на пошце чалавеку прыходзіць пасылка, якую ён аплачвае і атрымлівае. Аднак у пасылцы аказваецца не дарагі мабільны тэлефон, а «іншы падарунак» — падарункавы сертыфікат і шмат упаковачнай паперы. Гэта робіцца для павелічэння аб'ёму пасылкі і стварэння ўражання, што там знаходзіцца каштоўная рэч, каб пры атрыманні спажывец не адмовіўся ад яе.

Пры гэтым падарункавы сертыфікат (напрыклад, коштам Br450) можна выкарыстоўваць толькі пры куплі тавараў, якія змяшчаюцца ў прыкладзеным да яго каталогу. А ў гэтым каталогу да рэалізацыі прапануюцца звычайныя недарагія тавары па высокай цане (напрыклад, тарка для агародніны за Br99, набор кантэйнераў за Br120, уцепленая павязка на галаву за Br118 рублёў і гэтак далей). Гэта значыць, аказваецца, што рэальны кошт такіх тавараў ніжэйшы за кошт паслуг паштовай сувязі і паслуг адпраўніка.

«Калі паступіў такі званок, МАРТ рэкамендуе адмаўляцца ад атрымання сумнеўных падарункаў і ад аплаты паслуг па іх перасылцы, бо выказванне згоды на атрыманне падарунка на пошце і згоды на аплату паштовых паслуг і паслуг адпраўніка ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам з'яўляецца вуснай здзелкай. Згодна з законам «Аб абароне правоў спажыўцоў» чалавек мае права ў аднабаковым парадку адмовіцца ад выканання дагавора аб аказанні паслугі, але пры ўмове аплаты выканаўцу фактычна панесеных ім расходаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам», — адзначылі ў Міністэрстве.



# АСЯРОДДЗЕ ДЛЯ ЎСІХ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Новы закон прадугледжвае распрацоўку прававога акта, які будзе вызначаць парадак даступнасці для інвалідаў на аб'ектах сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, транспартных сродкаў. У гэтых правілах прадугледжана, які мусіць быць аб'ект, цалкам даступны для ўсіх грамадзян: прылеглая тэрыторыя, паркоўкі, уваходная група, унутраныя памяшканні, у тым ліку і санітарныя пакоі.

Будзе створана і новая інфармацыйная база — своеасаблівы гід па бесперашкодным перасоўванні ў гарадскім асяроддзі. Яна будзе ўтрымліваць звесткі аб элементах безбар'ернага асяроддзя ўсіх аб'ектаў адукацыі, аховы здароўя, фізкультуры і спорту і іншых, і карыстальнік будзе разумець: даступны гэта аб'ект, часткова даступны ці недаступны. Такую інфармацыю Нацыянальнае кадастравае агенцтва размесціць на публічнай кадастравай карце.

Аднак дзейныя аб'екты, асабліва ў старых будынках, не заўсёды можна абсталяваць з улікам усіх патрабаванняў. Новы закон у абавязковым парадку прадпісвае ў такіх выпадках звяртацца ў грамадскія аб'яднанні інвалідаў для прыняцця сумесных рашэнняў па стварэнні элементаў даступнага асяроддзя. Акрамя таго, у такіх выпадках прадугледжана яшчэ і сітуацыйная дапамога — аказанне суправаджэння тым грамадзянам, якія не могуць самастойна перасоўвацца.

Яшчэ адно істотнае нававядзенне — закон замацоўвае абавязацельствы па вызначэнні паркавачных месцаў для інвалідаў 1-й і 2-й груп і інвалідаў 3-й групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. На кожнай мусяць быць забяспечаны такія месцы, у тым ліку і па месцы пражывання.

Як адзначыла Святлана Капура, у Беларусі каля 18 % аб'ектаў сталі цалкам даступнымі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Да 2025 года плануецца іх колькасць павялічыць да 23 %.

## СУЧАСНАЕ ЖЫЛЛЁ ДЛЯ КАЛЯСАЧНІКАЎ

Як вядзецца гэта работа ў рэгіёнах, расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама Наталля ІГНАТОВІЧ.** У Мінскай вобласці пражывае 1 мільён 470 тысяч чалавек, з іх 6 % інвалідаў, а гэта 89 тысяч 900 чалавек. З 2016 да 2020 года ў Мінскай вобласці элементамі безбар'ернага асяроддзя было абсталявана каля 1,5 тысячы аб'ектаў. У асноўным гэта пандусы і ўдасканаленне ўваходнай групы для інвалідаў-калясачнікаў. З мінулага года прымяняецца комплексны падыход, каб зрабіць той ці іншы будынак цалкам даступным для любых катэгорый. Плануецца, што да 2025 года каля 500 аб'ектаў сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры ў рэгіёне атрымаюць 100-працэнтную даступнасць.

ўкараняцца і ў іншых раёнах вобласці.

У рэгіёне функцыянуе 25 аддзяленняў дзённага знаходжання для інвалідаў, 903 чалавекі карыстаюцца іх паслугамі: займаюцца ў гуртках, праходзяць працоўную і сацыяльную рэабілітацыю. У рамках гэтых аддзяленняў працуе 55 рэабілітацыйна-працоўных майстэрань, 134 гурткі, 86 клубаў. Падвозяць сюды людзей з інваліднасцю на спецыялізаваным транспарце. У Мінскім раёне адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання для маладых людзей ад 16 да 31 года з цяжкімі і множнымі парушэннямі развіцця. Гэта і палёгка для бацькоў, і добры рэабілітацыйны кампанент.

**Два гады таму ў Крупках падчас дыялогавай пляцоўкі людзі з інваліднасцю папрасілі прадугледзець магчымасць будаўніцтва максімальна адаптаванага жылля.**

Немалаважным з'яўляецца і маніторынг тых аб'ектаў, якія абсталёўваюцца элементамі безбар'ернага асяроддзя. Яны праводзяцца з удзелам прадстаўнікоў грамадскага аб'яднання інвалідаў.

— Падчас маніторынгавых мерапрыемстваў мы бачым, ці правільна зроблены пандус, уваходная група, бо часам элементы даступнага асяроддзя ёсць, але карыстацца імі немагчыма. У такім выпадку мы выносім заўвагі, якія потым выпраўляюць, — адзначыла Наталля Ігнатовіч.

Ёсць прыклады ў рэгіёне і кардынальнага паляпшэння ўмоў жыцця для інвалідаў. Два гады таму ў Крупках падчас дыялогавай пляцоўкі людзі з інваліднасцю папрасілі прадугледзець магчымасць будаўніцтва максімальна адаптаванага жылля, паколькі немагчыма ўдасканаліць стары жыллёвы фонд. У выніку пры садзейнічанні кіраўніцтва райвыканкама было закладзена будаўніцтва трох кватэр, цалкам адаптаваных для інвалідаў-калясачнікаў.

У жніўні бягучага года гэтыя кватэры (дзве аднапакаёвыя і адна двухпакаёвая) на першым паверсе ў шматкватэрным жылым доме былі здадзены. Прылеглая тэрыторыя і само жыллё цалкам адпавядаюць усім патрабаванням. Гэта і тактыльная плітка для людзей з праблемамі зроку, і абсталяваная дзіцячая пляцоўка, і пляцоўка са спартыўнымі трэнажорамі, добраўпарадкаваная ўваходная група з пад'ёмнікам, пашыранымі дзвярнымі праёмамі, адсутнасць бардзюраў у двары і парогаў у кватэры, таму калясачнік можа бесперашкодна рухацца паміж пакоямі, санвузламі і балконам. Засяліліся ў гэтыя кватэры два маладыя мужчыны з інваліднасцю і жанчына з дзіцем-інвалідам. Такая практыка будзе

— У рамках новага закона на працягу 2-3 гадоў прадугледжана арганізаваць на базе кожнага тэрытарыяльнага цэнтра па ўсёй краіне рэабілітацыйныя аддзяленні, дзе будзе кампанент як сацыяльнай, так і працоўнай рэабілітацыі для інвалідаў, — падкрэсліла Наталля Ігнатовіч.

У Смалявічах адкрыта першая ў Мінскай вобласці (і другая ў краіне) трэніровачная кватэра для інвалідаў. Праект дзейнічае з мінулага года. Штомесячна восем інвалідаў, якія маюць інтэлектуальныя расстройствы, праводзяць два тыдні ў гэтай кватэры. Яны вучацца самастойнаму пражыванню і самаабслугоўванню.

— Калі раней іх цалкам апякалі бацькі, то пасля такой сацыяльна-бытавой адаптацыі яны самастойна гатуюць сабе простыя сняданак. Такія трэніровачныя кватэры ёсць толькі ў Мінску і Мінскай вобласці, але па гэтым шляху ідуць і іншыя рэгіёны, — удакладняе Наталля Ігнатовіч.

## СУБСІДЫІ ДЛЯ АДКРЫЦЦЯ СВАЁЙ СПРАВЫ

У Мінскай вобласці пражывае амаль 33 тысячы людзей з інваліднасцю ў працаздольным узросце. З іх 60 % маюць працоўныя рэкамендацыі — больш за 18 тысяч чалавек. Дзякуючы новаму закону з'явіўся дадатковы механізм у працаўладкаванні — кватаванне працоўных месцаў. Прадпрыемству даводзіцца квота па стварэнні працоўных месцаў для інвалідаў, і яно мусіць прымаць на работу людзей з інваліднасцю.

Сёння ў людзей з інваліднасцю запатрабаваныя спецыяльнасці эканамічнага, бухгалтарскага, юрыдычнага профілю, якія дазваляюць працаваць на аддаленцы. У Мінскім раёне ёсць каледж, дзе навучаюць гэтым спецыяльнасцям.

**«Часта гэта датычыцца прыватных і нават некаторых дзяржаўных крам: стаіць пандус, заходзіш далей, а там немагчыма перасоўвацца».**

Запланавана яго абсталяванне такім чынам, каб тут маглі навучацца інвалідыкалясачнікі.

— Наша дзяўчынка, інвалід-калясачнік, выпускніца Івянецкага дома-інтэрната, сёлета паступіла ва ўніверсітэт фізічнай культуры на спартыўнага псіхолага. Калі чалавек навучаецца прадпрымальніцкай дзейнасці, мы выдаём субсідыю, гэта добрая падтрымка на набыццё матэрыялаў і развіццё сваёй справы. У Салігорску наш інвалід-калясачнік вучыўся на сталічным пратэзным заводзе і атрымаў спецыяльнасць абутніка, адкрыў з дапамогай субсідыі сваю майстэрню і цяпер, акрамя пенсіі, можа і зарабляць.

— Сёння сацыяльная пенсія, якую многія атрымліваюць, невялікая, таму, вядома, магчымасць працаваць мусіць быць, — дадае **старшыня цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў Васіль ЛУКАШЭВІЧ.** — Аднак пры кантактаванні высвятляецца, што людзі жадаюць ездзіць на працу, а не знаходзіцца на аддаленцы.

Пры гэтым ён удакладняе, што раней таварыства не магло запрасіць сваіх членаў нават на мерапрыемствы, бо яны не маглі самастойна выходзіць з жылля. Цяпер пераважна ўсё абсталявана, і з гэтым няма ніякіх праблем. Аднак часта ўзводзяць «самабуды», якімі немагчыма карыстацца.

— Пытанне ж ставіцца, каб чалавек сам, без чужой дапамогі, мог карыстацца тым жа пад'ёмнікам. Яшчэ адна вялікая праблема — ухіл пандуса, які мусіць быць не больш за дзевяць градусаў. А робяць, як правіла, як атрымаецца: то труба перашкаджае, то тратуар. Цяпер мы патрабуем поўны комплекс, пачынаючы са стаянкі і заніжанага бардзюра і заканчваючы санвузлом, а не толькі пандус, як многія ўспрымаюць. Часта гэта датычыцца прыватных і нават некаторых дзяржаўных крам: стаіць пандус, заходзіш далей, а там немагчыма перасоўвацца. Ёсць пытанні па вакзалах: пероны не адпавядаюць узроўню выхаду з вагонаў. Гэта вялікая праблема, асабліва ў рэгіёнах.

Наконт працаўладкавання Васіль Лукашэвіч адзначыў, што цяпер і месцы працоўныя ствараюцца, і наймальнікі атрымліваюць кампенсацыі, галоўнае — жаданне працаваць. Калі патрабуецца навучанне, то звяртацца варта ў таварыства інвалідаў — дапамогуць і з навучаннем, і з працаўладкаваннем.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# СКАНДЫНАЎСКІ АНТЫЦЫКЛОН ПРЫНЁС ХОЛАД З ЗАПАЛЯР'Я

## Уначы на сераду месцамі па краіне стартуюць замаразкі да мінус трох градусаў

**Мы ўжо прывыклі, што з надыходам восені ў нашай краіне пачынаецца позні грыбны сезон. А гэта значыць, што верасень звычайна багаты на шчодрыя ападкі пры ўмераным паніжэнні тэмпературы. Звычайна, але не гэтым разам. Прыход восені сёлета адзначыўся рэзкім паніжэннем тэмпературнага фону. Халоднае паветра з Запаляр'я апусціла паказанні тэрмометраў да нязвыклых адзнак, калі ў начныя гадзіны яны даходзяць да плюс 1—9 градусаў, месцамі пры малавоблачным небе назіраюцца восеньскія замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Дзённая тэмпература паветра па краіне не перавышае плюс 15—22 градусы. Такі тэмпературны рэжым у асноўным на 1—6 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Па словах сіноптыкаў, захаваецца ўплыў скандынаўскага антыцыклону, які будзе ўтрымліваць халоднае надвор'е. У гэты час істотных ападкаў па краіне ў асноўным не чакаецца. Толькі ў сераду раніцай і днём па поўначы і паўночным усходзе, а ўначы ў чацвер месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы.

У аўторак пераважна без ападкаў. У ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе слабы туман. Удзень тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 12 да плюс 18 градусаў.

У сераду пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём на поўначы і паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, месцамі замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 13—20 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 22.

У чацвер уначы месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, а ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы плюс 2—9 градусаў, а ў асобных раёнах чакаюцца замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 13—20 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах плюс 21—23 градусы.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу цэнтр антыцыклону перамесціцца на тэрыторыю Расіі, таму паўднёва-заходнія рэгіёны нашай краіны апынуцца пад уплывам атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы, у сувязі з гэтым тут пройдуць кароткачасовыя дажджы. Пры гэтым у найбліжэйшыя выхадныя ўплыў франтальных раздзелаў распаўсюдзіцца на большую частку тэрыторыі Беларусі. 9 верасня ноччу па Брэсцкай вобласці, а ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман, тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 1 градуса па паўночным усходзе да плюс 10 градусаў па паўднёвым захадзе. Месцамі сіноптыкі абяцаюць замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 13—20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХЛЕБНАЕ СВЯТА ПЕРШАГА РЭГІЁНА

## Брэстчына адзначыла абласныя «Дажынкі». Фэст прайшоў у Целяханах Івацэвіцкага раёна

**Такога фэсту старажытныя Целяханы не бачылі, напэўна, з паўстагоддзя — гэтую думку ў розных варыяцыях агучвалі многія сталыя жыхары пасёлка. Сапраўды, зранку наваколле было расквечана стракатымі фарбамі кірмашу, мноствам па-святочнаму прыбраных людзей, усмешкамі гасцей і ўдзельнікаў, якія сустракалі тут сяброў і знаёмых. Героі дня былі пазнавальныя здалёк па яркіх стужках перадавікоў. Настрой стварала бадзёрая музыка і лагоднае вераснёўскае сонейка.**





Фестываль паступова браў разгон у раёне кірмашовых шатроў на цэнтральных вуліцах населенага пункта. Руплівыя гаспадыні прыцэньваліся да рознай смакаты і далікатэсаў, турысты-адпачывальнікі адразу займалі месцы ў сезонных кафэ. Арганізатары сказалі, што ўсяго было разгорнута каля 140 гандлёвых павільёнаў, а ў летніх кавярнях адначасова маглі адпачыць да 1700 чалавек.

Асобныя вытворцы зладзілі не проста выставы сваёй прадукцыі, афармілі іх як экспазіцыі-падворкі. Тут можна было не толькі набываць, але і любавацца, разглядаць. А колькі кампазіцый, зробленых са збожжавых культур, сапраўдных твораў мастацтва прывезлі на свята!

А побач з саламянай прыгажосцю, як правіла, суседнічаюць самыя розныя хлебныя шэдэўры. Гэтым разам маю ўвагу звярнуў на сябе шыкоўны каравай з выпечанымі каласкамі і дарамі восені. Як высветлілася, яго аўтар — **Святлана КАЛІНОЎСКАЯ,** вядомая ў Высокім Камянецкага раёна майстрыха ў справе хлебапячэння.

— Якія ж дажынкі без караваю?! — падзялілася эмоцыямі Святлана Фёдараўна. — Вунь іх колькі, сімвалаў свята: усе прыгожыя, усе зробленыя з любоўю. Галоўнае, каб было збожжа, былі мір і дабрабыт у краіне, а хлеба мы напячом.

За час падрыхтоўкі да фестывалю пасёлак змяніўся грунтоўна. Зроблена сапраўды многа, асабліва на сацыяльных аб'ектах. Тое, што цярпліва чакала абнаўлення, рамантавалі ў першую чаргу. Такім чынам мадэрнізавалі шэраг інжынерных камунікацый. Асфальт пракладзены на 11 кіламетрах вуліц. На вуліцы 1 Мая з'явіўся водаправод. Тратуары з ліўнёўкай паклалі па вуліцы Савецкай. Абноўлена вулічнае асвятленне, устаноўлены новыя дзіцячыя пляцоўкі...



Дажынкі спраўлялі ў адпаведнасці з традыцыямі мінулага, свята ўраджаю адзначылі годна, як гэта рабілі продкі. Апошні факт адзначалі і шматлікія госці фестывалю. Павіншаваць хлебаробаў Брэстчыны прыехалі **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, намеснік прэм'ер-міністра краіны Леанід ЗАЯЦ, старшыня парламенцкай камісіі ў Савеце Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ, міністр сельскай гаспадаркі Ігар БРЫЛО.**

Ігар Сергеенка адзначыў, што кожныя дажынкі ў невялікім населеным пункце — гэта рух наперад, пэўны прагрэс у развіцці, бо вядзецца сур'ёзная работа па падрыхтоўцы, населены пункт мяняецца ў лепшы бок. Леанід Заяц падзякаваў хлебаробам Брэстчыны за дастойны ўклад у харчовую бяспеку краіны — чвэрць рэспубліканскага караваю брэсцкая.

Па традыцыі ўрачыстая частка дажынак пачалася з шэсця перадавікоў жніва. Першае месца сярод раёнаў па выніках уборачнай кампаніі заняў Ляхавіцкі раён. Другое і трэцяе месцы адпаведна — Драгічынскі і Пружанскі. Сярод гаспадарак найлепшай прызнана ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Баранавіцкага раёна. Два другія пераможцы — з Пружанскага раёна: філіял «Айчына» ААТ «Белавежскага» і ААТ «Вялікасельскае агра». Па многіх намінацыях ушанавалі камбайнераў, вадзіцеляў, якія адвозілі збожжа, машыністаў збожжасушыльных комплексаў, спецыялістаў гаспадарак і іншых удзельнікаў жніва.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка зачытаў Прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы аграрыям Брэстчыны, у якім Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што шчодры ўраджай сёлетняга года сімвалізуе найлепшыя якасці нашых хлебаробаў.

А хлебаробам Брэстчыны было чым ганарыцца на свяце. Першымі ў краіне завяршылі ўборку з надзвычай добрымі вынікамі. Усяго атрымана 1,4 мільёна тон збожжа (без уліку грэчкі, проса, кукурузы). Па валавым зборы дадалі 200 тысяч тон. Ураджайнасць склала амаль 40 цэнтнераў з гектара. Цудоўны ўраджай даў, напрыклад, азімы ячмень — 52 цэнтнеры намалацілі з кожнага гектара. Ды і іншыя культуры не падвялі.

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** ў сваім выступленні падкрэсліў, што аграрыі рэгіёна замацавалі за сабой лідарскія пазіцыі па тэмпах жніва. «Сёння добры ўраджай — аснова харчовай бяспекі краіны і яе суверэнітэту. І вы не падвялі, — сказаў губернатар, звяртаючыся да аграрыяў. — Дастойна адстаялі гонар першага рэгіёна».

Агульны настрой дня выказаў пераможца спаборніцтва сярод маладых камбайнераў, **чатырохтысячнік з сельгаспрадпрыемства «Белавежскі» Камянецкага раёна Андрэй КАБЯТКА,** калі сказаў: «Мне падабаецца мая работа». І ўсе, хто атрымліваў у гэты дзень розныя ўзнагароды, несумненна, любяць сваю справу. Таму і вынікі добрыя, таму і свята атрымалася.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# СВЯТЫНІ, ЯКІЯ НАС ЯДНАЮЦЬ



У першыя дні верасня больш за 1300 кіламетраў праехалі і прайшлі хрэсным ходам удзельнікі XXIX Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў». Гэта экспедыцыя штогод адпраўляецца з Мінска да чарговай сталіцы святкавання Дня беларускага пісьменства. Сёлета маршрут з Мінска да Добруша пралёг праз многія гарады і вёскі Гомельскай вобласці. Прайшлі сустрэчы насельніцтва з вядомымі філолагамі, гісторыкамі, дзеячамі культуры і мастацтва. Адбыліся ўрачыстыя мітынгі каля помнікаў гістарычных падзей мінулага, памінальныя богаслужэнні на месцах, дзе пахаваны воіны і партызаны, якія баранілі і вызвалялі Радзіму. Ва ўсіх населеных пунктах па маршруце экспедыцыі яе ўдзельнікі разгортвалі перасоўныя выставы дакументаў і фотаматэрыялаў гістарычнай тэматыкі, якія сабралі за мінулыя гады. Для ўдзельнікаў агульных богаслужэнняў у гарадах і вёсках паўсюль была магчымасць запаліць свае свечкі ад прынесенай экспедыцыяй лампады з непагасным агнём ад Гроба Гасподняга ў Іерусаліме.







**Яўген ПЯСЕЦКІ (удзельнік усіх папярэдніх экспедыцый).**







Жыллё маё

# ЗЯЛЁНЫ І КАПІТАЛЬНА АДРАМАНТАВАНЫ

## Што робіцца для добраўпарадкавання сталічных двароў

**Амаль 50 тысяч кустоў і звыш дзевяці тысяч дрэў павінны з'явіцца сёлета ў сталічных дварах. З пачатку года ўжо было высаджана больш чым пяць тысяч дрэў і 24 тысячы кустоў, адрамантавана звыш 33 гектараў газонаў. Мяркуецца, што за 2022 год прывабны выгляд атрымаюць 814 дваравых тэрыторый Мінска, шэсць будуць капітальна адрамантаваны, а ў 142 дварах зробяць комплексны бягучы рамонт. Што мяняецца ў дварах і як жыхарам паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні тэрыторый каля сваіх дамоў, расказала спецыяліст жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

### А ТЫ ПАСАДЗІЎ ДРЭВА?

Мерапрыемствы па бягучым і капітальным рамонце элементаў добраўпарадкавання, якія змешчаны на прыдамавых тэрыторыях шматкватэрнай жылой забудовы, а таксама догляд, аднаўленне і абнаўленне драўнінна-хмызняковай расліннасці, праводзяцца ў сталіцы штогод. Гэта робіцца для паляпшэння ўзроўню добраўпарадкавання двароў, удасканальвання іх знешняга выгляду, стварэння бяспечных і камфортных умоў для пражывання, расказала **Вольга ЯГОРАВА, начальнік аддзела па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні жыллёвага фонду Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі**:

— Адрамантавана больш як 200 тысяч м$^2$ пакрыццяў дваравых праездаў (па плане — 207,5 тысячы м$^2$), амаль 84 тысячы м$^2$ пакрыццяў пешаходных сувязяў (па плане — 98,5 тысячы м$^2$), 75 вонкавых лесвіц, звыш 3500 кантэйнерных пляцовак. Даведзена да ладу больш за 30 тысяч адзінак малых архітэктурных формаў (лаўкі, сметніцы і іншае), 4720 такіх адзінак устаноўлена замест дэмантаваных раней. Адрамантавана таксама 17 адзінак дзіцячага гульнявага і спартыўнага абсталявання, 416 — пастаўлена ўзамен дэмантаванага раней.

Работы па бягучым рамонце выконваюцца згодна з планамі, якія фарміруюцца па выніках восеньскага агляду жыллёвага фонду. А таксама з улікам заяў і зваротаў ад грамадзян, нагадала спецыяліст і падкрэсліла, што беларусы заўжды актыўна ўдзельнічаюць у месячніках па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый. Гэтаму садзейнічае ў тым ліку праект «Зялёны двор разам!». У сталіцы, дарэчы, размешчана 78 банераў «А ты пасадзіў дрэва?», з дапамогай якіх камунальнікі спадзяюцца далучыць да ўдзелу ў добраўпарадкаванні двароў яшчэ больш жыхароў.

### У ТЭМУ

Камунальнікі сталічнай вобласці абслугоўваюць больш за 4,5 тысячы прыдамавых тэрыторый плошчай звыш 70 мільёнаў м$^2$. Добраўпарадкаваць сёлета яны мяркуюць 91 двор. У дварах Міншчыны знаходзіцца 1990 дзіцячых гульнявых спартыўных пляцовак, дзе ўстаноўлена больш як восем тысяч адзінак абсталявання. Ужо адрамантавана 188 адзінак дзіцячага гульнявога абсталявання, 450 м$^2$ пешаходных сцежак і амаль тры тысячы м$^2$ дарожнага пакрыцця двароў, у больш як 330 пясочніцах заменены пясок, адрамантаваны чатыры дваравыя прыбіральні, устаноўлены дадатковыя кантэйнеры (144) для раздзельнага збору адходаў.



### ПРАВІЛЫ ПАСАДАК, АФАРБОЎКІ І ГУЛЬНІ

Беларусы таксама выступаюць з уласнымі ініцыятывамі, робяць кветнікі, фінансава ўдзельнічаюць у набыцці абсталявання для двароў і ўладкаванні велагаражоў. Пры гэтым сумясціць грошы людзей і бюджэту, каб сумесна купіць для двара прадметы, не прадугледжаныя планам, нельга. Калі жыхары хочуць нешта пазапланавае, яны мусяць рабіць гэта цалкам за свой кошт.

А яшчэ штогод камунальнікі летам праводзяць агляды конкурс на найлепшае кветкавае афармленне агародчыкаў і балконаў.

— Жыхары выкарыстоўваюць для ўпрыгожвання тэрыторый усёмагчымыя сарты кветак, прыродныя матэрыялы накшталт камянёў і драўніны. Шыны і мяккія цацкі — неадназначны варыянт для ўпрыгожвання. Мала таго, што гэта гаручыя матэрыялы, дык шыны — гэта яшчэ і адходы, і ў сталічным двары прымяняюць іх, пэўна, не вельмі эстэтычна, — адзначыла прадстаўніца ЖКГ. — Тым не менш, калі гэта ў разумных межах, то чапаць такія «кветнікі» не будуць. Аднак у недапушчальных выпадках выдаюцца прадпісанні на ўстараненне падобных звалак.

Найлепшы двор і найлепшы пад'езд — конкурс для жыллёва-камунальных службаў, дадала Вольга Ягорава. Аднак у дварах і пад'ездах-пераможцах заўжды ёсць не толькі капрамонт, але і бачны ўдзел жыхароў. Зробленыя імі ўпрыгожванні становяцца тымі разыначкамі, дзякуючы якім двары і пад'езды набываюць індывідуальнасць.

Пры азеляненні і ўпрыгожванні двароў трэба памятаць, што існуе пералік работ, якія трэба ўзгадняць у службах ЖКГ. Гэта, напрыклад, пасадка дрэў і кустоў на пэўнай адлегласці ад фасада дома, праезнай і пешаходнай часткі, падземных камунікацый. А таксама ўстаноўка малых архітэктурных форм і дзіцячага гульнявога абсталявання, іх афарбоўка. Існуюць нормы аддаленасці абсталявання адно ад аднаго (трэба ўлічваць месца для зоны падзення і зоны прызямлення), а афарбоўка па прынцыпе «як каму падабаецца» можа зрабіць двор безгустоўным, таму колер таксама лепш узгадніць з жыллёвымі службамі, параіла спецыяліст.

На кожнай дзіцячай пляцоўцы сёння ёсць інфармацыйныя шыльды ці налепкі з правіламі карыстання пляцоўкай, дзе напісана, як і каму можна ёй карыстацца (дзеці да 14 гадоў вагой да 70 кілаграмаў), а таксама ўказаны нумары службаў экстраннай дапамогі і арганізацый, якія абслугоўваюць пляцоўку.

### КАПІТАЛЬНЫ І ПРАМЕЖКАВЫ ВАРЫЯНТЫ

Штогод у сталіцы рэалізоўваецца праграма і па капітальным рамонце дваровых тэрыторый. Сёлета такі рамонт будзе зроблены на шасці аб'ектах — 14 прыдамавых тэрыторыях. На 22 аб'екты — 87 прыдамавых тэрыторый — будзе зроблена праектна-каштарысная дакументацыя. Капрамонт найперш прадугледжаны для тых двароў, у дамах якіх ужо адбыўся капітальны рамонт.

— На чатырох аб'ектах (васьмі прыдамавых тэрыторыях) ужо завершаны будаўнічамантажныя работы. Яшчэ па двух аб'ектах яны завершацца ў найбліжэйшы час, — падзялілася Вольга Ягорава. — Асноўныя віды работ, якія выконваюцца падчас капрамонту, гэта замена існуючых пакрыццяў дваравых праездаў і пешаходных сцяжынак, дзіцячага гульнявога абсталявання, малых архітэктурных формаў, капітальны рамонт лесвіц, устаноўка агароджаў каля дзіцячых пляцовак, уладкаванне месцаў для збору і захоўвання адходаў, тратуараў уздоўж дамоў. У старой жыллёвай забудове тратуараў часцей за ўсё няма, таму работы робяцца толькі пры капрамонце, бо на гэта трэба распрацоўваць праектную дакументацыю. Тратуары могуць пакласці таксама ў месцах, пратаптаных жыхарамі.

Каб заахвочваць людзей да спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў, у дварах пры капрамонце можна ставіць таксама велагаражы. Сёлета ў мінскіх дварах з'явіліся тры гаражы на 76 веламесцаў.

Капітальны капрамонт двароў, аднак, не паспявае за капрамонтам дамоў, таму з 2021 года камунальнікі прымяняюць такі падыход, як комплексны бягучы рамонт прыдамавых тэрыторый, дзе капрамонт дамоў адбыўся ў апошнія пяць гадоў. Калі двор у выніку гэтага набывае добраўпарадкаваны выгляд, то і капрамонт як такі яму ў прынцыпе пазней можа не спатрэбіцца.

— Гэта своеасаблівы прамежкавы варыянт паміж кропкавым рамонтам ці заменай нейкіх асобных адзінак і поўным абнаўленнем прыдамавой тэрыторыі ў межах бягучага рамонту, — патлумачыла начальнік аддзела. — Пры такіх работах мяняюць, напрыклад, пліткавае пакрыццё на пешаходных сцежках, дзіцячае ці спартыўнае абсталяванне, малыя архітэктурныя формы, робяць азеляненне і іншыя віды работ, на якія не трэба распрацоўваць праектную дакументацыю. Такім чынам тэрыторыя прыводзіцца ў належны стан, набывае эстэтычны і сучасны выгляд.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

---

Не казка

# Спонсар

**— ...Ну як жа тут можна разабрацца? — лямантавала жанчына сталага веку каля інфакіёска, куды яе накіравалі з банкаўскай касы. Гэты від аплаты цяпер, калі ласка, рабіце самі, праз інфакіёск, які вынесены ў асобнае памяшканне. Памяшканне знайшла, апарат — таксама, але плаціць такім чынам даводзіцца першы раз — вось і разгубілася. Трымае паперку, углядаецца ў лічбы і нервова тыцкае па кнопках. Спрабуе раз за разам, але штосьці не атрымліваецца.**

Непадалёк ад яе хлопчык гадоў дзесяці — з тэлефонам у руках і ў навушніках. Нібыта і не з ёй, а ў свавім свеце. Праўда, раз-пораз кідае позіркі на бабулю, чакае. Нехта раіць пашукаць кансультанта. А яна, відаць, баіцца паказаць сваю бездапаможнасць перад прасунутым унукам, імкнучыся не ставіць пад сумненне свой аўтарытэт бабулі, не спяшаецца з гэтым. І калі ўжо звяртаецца па дапамогу да тых, хто падыходзіць да іншага апарата, малы здымае навушнікі і бярэ ініцыятыву на сябе: «Ну што там?..» Яна разводзіць рукамі: «Мо пойдзем?...» — «Дык дарма ішлі, ці што? Давай жа зробім!» — настойвае ён.

Хлопчык падыходзіць да апарата, бярэ ў бабулі паперку, дзелавіта разглядае. А потым удакладняе, што яны павінны рабіць. Тая тлумачыць. Ён выбірае, цісне «далей»... Яна падказвае, ён цісне. Яна дыктуе лічбы, ён набірае, уводзіць. І вось дайшлі да галоўнага: трэба ўносіць грошы.

Жанчына працягвае маломy грашовую паперку. «Не, гэта вельмі шмат, пашукай меншую». Але меншай у яе няма. Ды якая розніца, няхай будзе так. Малы тлумачыць, што апарат яе забярэ, але рэшту ён, хутчэй за ўсё, не выдае. «Як жа так?.. Дык усё будзе страчана? Колькі ж тады я заплачу... Вось жа пайшло жыццё...» — хапаецца за сэрца бабуля. Людзі побач падказваюць, што можна зрабіць іншы ўнёсак, напрыклад, на тэлефон. Яна нервуецца яшчэ больш: такая вялікая сума ёй на тэлефоне непатрэбная, і яна на яе, шчыра кажучы, разлічвала, вось з унукам яшчэ ў краму схадзіць трэба. А, дык можна ж пайсці ў касу банка, папрасіць, каб размянялі. Ой, гэта ж зноў брацца квіточак, стаяць, чакаць, і пасля тут усё спачатку ўводзіць — а ўжо так усё добра атрымалася.

«Трымай», — унук рашуча аддае ёй у рукі паперку. Расшпільвае куртку і з унутранай кішэні дастае акуратненькі кашалёк з карткай. І без лішніх слоў робіць аплату, пакуль агаломшаная бабуля лыпае вачыма.

Адыходзяць, яна абапіраецца на сцяну. Твар яе бялее — ад водбліску жудаснай здагадкі, якую яна імкнецца асэнсаваць. Запінаючыся, запытвае: «Адкуль гэта ў цябе? Не бойся, я нікому не скажу». — «Ты што... Гэта ж мама мне дала! На кішэнныя расходы». Жанчына выдыхнула: «Ну і ну, гэта ж трэба — каб у дзіцяці расходы былі, як у банкіра якога. Так усё і растраціш, бо не бачыш, колькі ідзе. Хіба нармальных грошай не магла даць?» — «Дык яна ж па картцы адразу бачыць, колькі я трачу. А я не трачу. Толькі на нешта важнае». — «Добра. Але я кампенсую». — «Бабуля, ты што? Мы ж адна сям'я. Вось хочаш, зараз у краме я расплачуся? У мяне засталася некранутая сума, выдаткаваная на тыдзень. Я ж магу табе дапамагчы і зрабіць нешта добрае...»

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», г. Минск ул. Казинца, 4, к. 304. УНП 101187767** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов** – спецтехника, бывшая в употреблении. Местонахождение: г. Минск, ул. Казинца, 4

| Номер лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль грузовой самосвал Маз-5516А5-380,** АМ 0642-7, 2011 г. в. | **10 920,00** |
| 2 | **Автомобиль грузовой самосвал Маз-5516А5-380,** АМ 4542-7, 2011 г. в. | **11 160,00** |
| 3 | **Машина подметально-уборочная МПУ-320 на базе трактора «Беларус-320»,** КА-7 2385, 2010 г. в. | **11 160,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в бел. рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения торгов

**Предмет аукциона должен быть оплачен** покупателем в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 2,5 % от цены продажи предмета аукциона в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 07.10.2022 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.10.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже имущества юридического лица, находящегося в процессе ликвидации

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00099** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов 21 сентября 2022 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Установка для штабелирования досок (за один участок штабелирования), инв. № 645. **Нач. цена**: 128 484,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток**: 12 848,40 бел. руб.

**Лот № 2.** Фрезерно-профильный комплекс ГИГА02, инв. № 296; транспортерная линия, инв. № 8202; циклон К-18 с воздуховодами, инв. № 264. **Нач. цена:** 272 280,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 27 228,00 бел. руб.

**Лот № 3.** Линия сортировки и окорки круглого леса, в том числе участок окорки, участок метало детекции, участок торцовки инв. № 326; линия сортировки кругляка, в т. ч. участок сортировки, разгрузочные площадки 6 шт., инв. № 108. **Нач. цена:** 189 540,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток**: 18 954,00 бел. руб.

Лоты № № 1–3 находятся по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, Ленина, 36.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: до 16.00 20.09.2022.**

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

***Суммы задатков по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код операции: 40901.***

Условия повторных электронных торгов: Победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by. Имущество бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна, тел. +375292953541.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предметы торгов**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-72406 (наименование: мастерская для ремонта сельскохозяйственной техники; назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), площадью 704,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 73/5.
**Обременение:** наличие действующего договора аренды

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **116 000,00** | **Размер задатка, руб.** | **11 600,00** |

**Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47727 (наименование: мастерская для ремонта сельхозтехники; назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнитель-ные станции)), площадью 481,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 73/12, 0,15 км севернее д. Старое Село, мастерская для ремонта сельхозтехники. Составные части и принадлежности: навес.
**Обременение:** наличие действующего договора аренды

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **76 200,00** | **Размер задатка, руб.** | **7 620,00** |

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, тел. 80162918132. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи в течение 2 месяцев с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 22 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 21 сентября 2022 г. до 17.00**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предметы торгов**

**Лот № 1:**
капитальное строение с инвентарным номером 110/С-6801 (наименование: административно-производственное здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 499,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Защитная, 13, на земельном участке 141000000007001583, площадью 0,2722 га, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное административно-производственное здание со складом ГСМ, двумя складами холодных агрегатов, сварочным цехом, калиткой, двумя воротами, калиткой, забором, асфальтовым покрытием, сетью водопровода, сетью канализации, кабельными линиями, пятью крыльцами.
*Обременение: наличие действующего договора аренды сроком до 11.05.2023*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 65 280,00 | **Размер задатка, руб.** | 6 528,00 |

**Лот № 2:**
1) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-36864 (наименование: производственный цех; назначение: здание многофункциональное), площадью 266,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, на земельном участке с кадастровым номером 144500000023000833, площадью 0,2381 га, составные части и принадлежности: железобетонный забор, ворота из металлической сетки;
2) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-36863 (наименование: гараж; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 81,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, на земельном участке с кадастровым номером 144500000023000833, площадью 0,2381 га, составные части и принадлежности: пеноблочный гараж, кирпичный склад, навес;
3) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-42130 (наименование: водопроводная сеть; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения), протяженностью 65,0 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, водопроводная сеть, составные части и принадлежности: трубопровод напорный, колодец камера

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 93 196,80 | **Размер задатка, руб.** | 9 319,68 |

**Продавец:** ОАО «Брестторгтехника», г. Брест, ул. ГОБК, 32, тел./ф 80162 21 55 31. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01. **Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее 27 сентября 2022 г. 10.00. Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 27 сентября 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 27 сентября 2022 г. до 10.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ООО «ГРОТЕКС», г. Гродно, ул. Пучкова, 46** |

**Предмет электронных торгов**

**Административно-хозяйственное здание**
(здание нежилое),
инвентарный номер 400/С-3330, общ. пл. 343,5 кв. м,
адрес: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пучкова, д. 46.
***Сведения о земельном участке:***
земельный участок общей площадью 0,1396 га, предоставлен продавцу для строительства и обслуживания административно-хозяйственного здания на праве аренды

**Начальная цена, без НДС – 277 020 бел. руб.**
Шаг торгов – 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350-080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете Звязда 10.08.2022

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **с 11.00 до 13.00 19.09.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.09.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-163518 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 158 кв. м, Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Сухая Долина, 14А.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422083611601000116, площадью 0,0303 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Индурский с/с, д. Сухая Долина, 14А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов.
Начальная цена продажи – 18 396 руб. (восемнадцать тысяч триста девяносто шесть рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 839 руб. (одна тысяча восемьсот тридцать девять рублей)

**ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-27331 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 113,5 кв. м, Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Горны, 55Б.**

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084002601000021, площадью 0,0791 га (назначение – эксплуатация и обслуживание магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Горны, 55Б.
Начальная цена продажи – 21 792 руб. (двадцать одна тысяча семьсот девяносто два рубля) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 179 руб. (две тысячи сто семьдесят девять рублей)

Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона:
- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;
- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя;
- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225 001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 06 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

**Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 04 октября 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion**

# З ВЕТРЫКАМ ПА ПРАСПЕКЦЕ!

## На што варта звярнуць увагу кожнаму прыхільніку «зялёнага транспарту»?

**Веласіпеды і самакаты — гэта модна, экалагічна, сучасна. А яшчэ гэта можа быць небяспечна. Для саміх «ездакоў» і для пешаходаў, якія часам выказваюць незадаволенасць колькасцю веласіпедаў і электрасамакатаў на вуліцах. Аб тым, ці правамерна іх абурэнне, мы вырашылі ўдакладніць у супрацоўнікаў ДАІ.**

У наша паўсядзённае жыццё трывала ўвайшлі так званыя сродкі персанальнай мабільнасці (пераважна электрасамакаты). Іншы «зялёны транспарт» — манаколы, гіраскутары, скейты, сіцібайкі — у мінулыя гады перажыўшы бум, цяпер, відавочна, скарачаюць сваю прысутнасць на вуліцах беларускіх гарадоў. Вытрымалі выпрабаванне часам і веласіпеды: іх колькасць пастаянна павялічваецца.

**Супрацоўнікі ДАІ прызнаюць, што веласіпедысты (як, зрэшты, і пешаходы на сродках персанальнай мабільнасці) — досыць уразлівая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху.**

Неабходнасць змяненняў правілаў дарожнага руху (ПДР) у тым, што датычыцца перасоўвання на веласіпедах і электрасамакатах, прадыктавана жыццём. І гэтыя змены ўступяць у сілу ў канцы кастрычніка. На што важна звярнуць увагу кожнаму прыхільніку «зялёнага транспарту»?

### ЭЛЕКТРАСАМАКАТ — НЕ ЦАЦКА

У апошнія гады з прыходам цяпла на вуліцах рэзка павялічылася колькасць карыстальнікаў электрасамакатаў і іншых «сродкаў персанальнай мабільнасці». Зрэшты, некаторыя не адмаўляюцца ад экалагічнага транспарту аж да снегападаў. Шматлікія шэрынгавыя кампаніі актыўна прапануюць усім ахвотным сродкі персанальнай мабільнасці, даючы магчымасць узяць іх у арэнду.



— З 27 кастрычніка ўступяць у сілу змены ў ПДР, якія датычацца перамяшчэння асоб на гэтых прыладах. У прыватнасці, уводзіцца вызначэнне «сродкі персанальнай мабільнасці», пад якім разумеецца прылада або прыстасаванне, што не з'яўляюцца транспартнымі сродкамі, прыводзіцца ў рух рухавіком і прызначаныя для індывідуальнага або сумеснага (у выпадку наяўнасці спецыяльна абсталяваных месцаў для сядзення) выкарыстання пешаходамі (электрасамакат, гіраскутар, сігвэй, манакола і іншае), — распавядае **старшы інспектар па асаблівых даручэннях ГУ ДАІ МУС Ганна БАНАДЫК.**

Заўважым, што асобы, якія перасоўваюцца на сродках персанальнай мабільнасці (тых жа электрасамакатах), ПДР прыраўноўваюцца да пешаходаў.

— Перасоўвацца на такіх прыладах неабходна па веласіпеднай дарожцы, а пры яе адсутнасці — па тратуары, пешаходнай дарожцы альбо абочыне, не ствараючы перашкоды іншым удзельнікам дарожнага руху, — распавядае старшы інспектар. — Перасячэнне праезнай часткі дарогі на сродку персанальнай мабільнасці павінна ажыццяўляцца па веласіпедным пераездзе або веласіпеднай дарожцы, а ў выпадку іх адсутнасці — па пешаходных пераходах.

Перасякаць дарогу ездакам на сродках персанальнай мабільнасці правілы загадваюць з хуткасцю пешахода, што ідзе шагам, загадзя знізіўшы хуткасць, падкрэслівае суразмоўца.

Сродак персанальнай мабільнасці павінен мець спраўныя тармазную сістэму і рулявое кіраванне (пры наяўнасці). У цёмны час сутак, а таксама ў светлы пры недастатковай бачнасці дарогі, пешаход (а мы памятаем, што ездакі на электрасамакатах, манаколах і г. д. кваліфікуюцца як пешаходы) павінен пазначыць сябе святлоадбівальным элементам, а на сродку персанальнай мабільнасці павінна быць ўстаноўлена і ўключана фара, якая дазваляе своечасова выявіць перашкоду для руху (напрыклад, разгледзець людзей, якія ідуць наперадзе). Пры руху на сродку персанальнай мабільнасці пешаходу рэкамендуецца выкарыстоўваць ахоўны шлем.

Пад забарону для «пешаходаў на сродках персанальнай мабільнасці» новыя правілы змяшчаюць язду з хуткасцю больш за 25 км/г; перавозку «пасажыраў» па-за спецыяльна абсталяванымі месцамі для сядзення, прадугледжанымі канструкцыяй сродку персанальнай мабільнасці, і язду не трымаючыся за руль (пры наяўнасці такога). Зразумела, забаронена карыстанне сродкамі персанальнай мабільнасці ў стане ап'янення. Таксама кіраваць электрасамакатамі не дазваляе новая рэдакцыя ПДР дзецям да 14 гадоў (выключэнне — пешаходныя і жылыя зоны, то-бок двары).

— Які б від перамяшчэння вы ні абралі, заўсёды будзьце ўважлівыя і асцярожныя. З павагай стаўцеся да навакольных, будзьце ветлівыя і дысцыплінаваныя, — раіць спецыяліст.

### СТАРЫ СЯБАР — ВЕЛАСІПЕД

Калі электрасамакаты, манаколы і іншыя дэвайсы можна назваць адным з сімвалаў трэцяга тысячагоддзя, то веласіпед — стары сябар усіх, хто па розных прычынах не жадае садзіцца за руль аўтамабіля, але хоча быць мабільным. Да самых халадоў гэта найбольш папулярны від транспарту як у горадзе, так і ў сельскай мясцовасці. А сёння ёсць віды веласіпедаў нават для зімовай язды.

— Хацелася б ізноў нагадаць элементарныя патрабаванні ПДР для гэтай катэгорыі ўдзельнікаў дарожнага руху, — адзначае Ганна Банадык. — Перш за ўсё, рухацца па праезнай частцы дарогі веласіпедыстам дазваляецца толькі ў выпадку адсутнасці абочыны, тратуара, пешаходнай або веласіпеднай дарожкі, але не далей за 1 метр ад правага краю дарогі; дзецям да чатырнаццаці гадоў забаронена кіраваць веласіпедам на дарозе без суправаджэння паўналетняй асобы (акрамя пешаходных і жылых зон, тратуараў, веласіпедных і пешаходных дарожак).

**Пажылых людзей (і не толькі пажылых) часам палохаюць веласіпедысты і самакатчыкі, што вылятаюць з-за спіны або выскокваюць насустрач. Бацькам даводзіцца больш уважліва сачыць за дзецьмі ў пешаходнай зоне.**

Новыя правілы дарожнага руху, якія ўступяць у сілу ў кастрычніку, прадугледжваюць шэраг навін і для веласіпедыстаў.

— У прыватнасці, рух веласіпедыстаў па праезнай частцы незалежна ад наяўнасці веласіпеднай дарожкі, абочыны, тратуара або пешаходнай дарожкі будзе дазволены:

• у зоне з абмежаваннем максімальнай хуткасці руху не далей чым 1 метр ад яе правага краю ў адзін шэраг;

• у ходзе вучэбна-трэніровачнага працэсу ў выпадку суправаджэння аўтамабілем прыкрыцця. Пры гэтым дапускаецца рух веласіпедыстаў у два рады, але не больш за 10 веласіпедыстаў у групе.

Па-ранейшаму ў цёмны час сутак, а таксама пры недастатковай бачнасці дарогі на веласіпедзе павінны быць уключаны: спераду — фара, якая выпраменьвае белае святло, а ззаду — ліхтар, які выпраменьвае чырвонае святло. Пры гэтым за межамі населеных пунктаў веласіпедыст павінен быць апрануты ў адзенне павышанай бачнасці са святлоадбівальнымі элементамі.

— Веласіпедыст абавязаны перасякаць праезную частку дарогі па веласіпедным пераездзе або веласіпеднай дарожцы, а пры іх адсутнасці — па пешаходным пераходзе, на перакрыжаванні — па лініі тратуараў або абочын, не ствараючы перашкод для руху пешаходаў, — адзначыла спецыяліст.



Згодна з новымі правіламі, пры перасячэнні праезнай часткі на пешаходных пераходах, веласіпедных пераездах веласіпедыст мае права не спешвацца.

— Пры руху на нерэгуляваных пешаходных пераходах, веласіпедных пераездах і рэгуляваных пешаходных пераходах, веласіпедных пераездах пры адначасовым для вадзіцеляў і веласіпедыстаў дазваляльным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора веласіпедыст мае перавагу перад іншымі транспартнымі сродкамі, — падкрэсліла інспектар. — У выпадку перасячэння праезнай часткі дарогі на перакрыжаванні па веласіпеднай дарожцы, па лініі тратуараў або абочын веласіпедыст абавязаны кіравацца патрабаваннямі транспартных святлафораў або рэгуліроўшчыка для транспартных сродкаў, а на нерэгуляваным перакрыжаванні — правіламі праезду нерэгуляваных скрыжаванняў і дарожнымі знакамі прыярытэту.

Пры пад'ездзе да скрыжавання з праезнай часткай дарогі веласіпедыст павінен загадзя знізіць хуткасць руху і, пераканаўшыся, што выезд на праезную частку дарогі бяспечны, перасякаць яе з хуткасцю пешахода, дадала яна.

І яшчэ адно важнае патрабаванне ПДР: перавозіць пасажыраў на веласіпедзе забаронена! Выключэнне — перавозка дзяцей ва ўзросце да сямі гадоў у веласіпедным шлеме на дадатковым спецыяльна абсталяваным сядзенні, якое фіксуе і засцерагае ногі дзіцяці.

Супрацоўнікі ДАІ прызнаюць, што веласіпедысты (як, зрэшты, і пешаходы на сродках персанальнай мабільнасці) — досыць уразлівая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху.

— Неабходна памятаць, што веласіпедысты абавязаны быць у некалькі разоў больш уважлівыя і асцярожныя за іншых удзельнікаў дарожнага руху. Яны самі адказваюць за сваю бяспеку, — падкрэслівае старшы інспектар па асаблівых даручэннях. — Аднак і кіроўцы аўтамабіляў павінны прызнаць, што веласіпед — транспартны сродак, якому ў некаторых выпадках законна дазволена рухацца па дарозе. Галоўная задача вадзіцеляў — быць уважлівымі пры перастройванні, здзяйсненні манеўраў і іншых дзеяннях, якія могуць скончыцца наездам на двухколавы транспарт.

### НЕ ЎСІМ ДАСПАДОБЫ

Калі яшчэ адносна нядаўна на тратуары пешаходы адчувалі сябе бестурботна, з прыходам у наша жыццё моды на ровары і іншыя «экалагічныя сродкі перамяшчэння» ім даводзіцца азірацца па баках. І далёка не ўсім гэта даспадобы.

«Шчыра кажучы, я пабойваюся веласіпедыстаў і асабліва электрасамакатчыкаў, — прызнаецца знаёмая. — Рухаюцца яны бясшумна, а хуткасці развіваюць высокія. Страшна падумаць, што можа быць, калі які-небудзь «гоншчык» не справіцца з кіраваннем і наедзе на пешахода».

Пажылых людзей (і не толькі пажылых) часам палохаюць веласіпедысты і самакатчыкі, што вылятаюць з-за спіны або выскокваюць насустрач. Бацькам даводзіцца больш уважліва сачыць за дзецьмі ў пешаходнай зоне. Пешаходам стала звыкла азірацца, калі яны вырашылі змяніць траекторыю руху па тратуары.

Праблему заклікаы вырашыць веладарожкі, але, па-першае, не ўсюды яны ёсць, ды і там, дзе ёсць, часам веласіпедысты і самакатчыкі імі грэбуюць. А па-другое, часта і пешаходы выходзяць на веладарожкі — напрыклад, у скверах і парках, ды і на тратуарах уздоўж гарадскіх вуліц. І тут ужо прыходзіць чарга абурацца «ездакам»: маўляў, што гэта пешаходы «блытаюцца пад коламі» там, дзе выдзелена месца для руху ровараў і самакатаў?

Кіроўцы кажуць пра тое, што цяпер даводзіцца быць асабліва ўважлівымі на святлафоры або на «зебры» — часам веласіпедысты і самакатчыкі з'яўляюцца з-за прыпаркаваных машын, не заўсёды зніжаючы хуткасць да пешаходнай.

— Пэўныя праблемы, вядома, ёсць — як і з любым новым, што з'яўляецца ў жыцці грамадства, — кажа Ганна Банадык. — Але экалагічныя віды перамяшчэння ўвайшлі ў наша жыццё трывала і надоўга. Таму важна паразуменне і выкананне Правілаў дарожнага руху.

Трэба памятаць, што, як бы ні змяняліся ПДР, бяспека кіроўцаў і пешаходаў цалкам залежыць ад свядомасці і тых, і другіх.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# МСЦІСЛАЎСКІ «ПАРЫЖ», РАСНЯНСКАЯ «ВІЛЬНЯ»

## Падарожжа ад Вярбоўкі да Віхры

**«...Ёсць гарады, звязаныя з табою нябачнай повяззю, самой музыкай свайго імя, або нечым трывалым, што вяжа з імі назаўсёды, нават супраць твайго жадання.**
**Ёсць для мяне некалькі такіх гарадоў на Беларусі. І адзін з іх — горад маёй маці, Мсціслаў».**
**Так пісаў у сваім эсэ пра падарожжа ў адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі Уладзімір Караткевіч.**

Праз трыццаць гадоў пасля яго ў Мсціслаў у межах праекта «У пошуках страчанага» з'ездзілі мы з гісторыкам і калекцыянерам Уладзімірам Ліхадзедавым. Вынікам стаў матэрыял «Руины тридцать лет спустя» («Беларусь сегодня», 17.08.2012).

Яшчэ праз дзесяць гадоў (і праз сорак пасля падарожжа Караткевіча) мне давялося зноў наведаць Мсціслаў. Напрыканцы лета, напярэдадні навучальнага года і Дня беларускага пісьменства, калі самы час абіраць фонам для падарожжа гісторыю беларускай кнігі...

### КАЗКА ПРА ГОРАД З САРАКА ЦЭРКВАМІ

А пачалося наша падарожжа з Расна. Сёння — невялікай вёскі на колішнім паштовым тракце з Магілёва ў Мсціслаў. Год заснавання паважаны — 1335. Ёсць легенда, што на месцы вёсак Расна і Малое Заполле калісь існаваў вялікі горад Вярба з сарака цэрквамі... Міфалагічнасці дадае і назва найбліжэйшай чыгуначнай станцыі Цёмны Лес, і Грымячая крыніца са святой вадой, шум ад якой чуваць здалёк, і ціхая рэчка Вярбоўка.

Ну, сарака храмаў у сённяшняй вёсцы дакладна няма. Затое руіны касцёла Святога Казіміра дужа адметныя. Бо гэты касцёл — паменшаная копія віленскага кафедральнага сабора. Сёння пра гэта сведчаць хіба велічныя калоны, якія яшчэ падпіраюць аблезлыя порцікі з чатырох бакоў будынка... З-пад пабелкі вызірае чырвань цэглы. І дах у касцёла самы высокі, які можа быць, — бо замест яго — неба.

Касцёл Святога Казіміра пачалі будаваць у Расна ў 1812 годзе, на месцы згарэлага драўлянага, што належаў езуітам. Было тут васямнаццаць акон і тры ганкі па тры прыступкі... Сёння тут улюбёнае месца для фотасесій, на нашых вачах пад'ехалі дзве экскурсіі. Унутры касцёла расце пустазелле.

Наведалі мы і яшчэ адзін храм... Толькі яго ўжо зусім не пазнаць. У 1929-м у Расна арганізавалі дзіцячы дом. Дырэктар, аматар паэзіі, нават дамогся, каб прысвоілі дому імя Аляксандра Пушкіна. На канцэрты і спектаклі, зладжаныя навучэнцамі, сыходзіліся з усяго раёна... Падчас вайны дзяцей не паспелі эвакуіраваць — фашысты высадзілі дэсант. Хтось з выхавацаў загінуў падчас бамбёжак на дарогах, кагосьці прытулілі добрыя людзі... Частка, дзясяткі два, вярнулася ў Расна. І два гады і тры месяцы ў акупацыі дзяцей апекавалі дзве выхавальніцы, а кармілі мясцовыя жыхары.

Вось у 1950-х дзіцячаму дому і перадалі будынак царквы, якая стаяла побач...

Каб убачыць, што тут была царква, трэба абысці вакол. Так, вось тут — паўкруглая частка... Высокі ганак, каля ўвахода — абраз святога Мікалая. Царква святога Мікалая тут была заснавана яшчэ ў канцы XVI стагоддзя. Гэтая, новая, каменная, збудавана ў 1891-м. Зачынена ў 1937-м, у канцы 1940-х перабудаваная ў някідкі прастакутнік...

Сёння тут — дапаможная школа-інтэрнат для дзетак з асаблівасцямі і сацыяльных сірот. Што ж, намоленае месца павінна іх ахоўваць...

### ПАЛАЦЫ, СКАРБЫ І РАЗРУХА

Ёсць у Расна і звычайная школа... Да 1990-х яна месцілася ў былым палацы Спытковых. Маёнтак калісь належаў Стахоўскім, але паколькі ўладальнікі ўдзельнічалі ў паўстанні 1864 года, яго канфіскавалі. На шэрай тынкоўцы колішняга палаца ёсць ахоўная шыльда, але занепад усё мацнее... Вокны забітыя дошкамі, да сцен караскаецца кустоўе. Рэшткі былой раскошы XIX стагоддзя ўнутры — хіба бела-блакітныя калоны, шмат разоў фарбаваныя. Але падлога праваленая, дах праломлены...

Падышлі мы яшчэ паглядзець на колішні бровар Спытковых. Ён у лесе, у самым гушчары — там захаваліся рэшткі некалькіх гаспадарчых будынкаў. Жнівеньская жамяра ўчыніла цэлы аркестр у шатах дрэў, што счапляліся над лясной сцежкай: ходзяць тут немавед чаго двуногія...

На выездзе з Расна, у засені старых дрэў, — высокі залаціста-белы абеліск: «Слава героям-землякам совхоза «Заветы Ленина», погибшим в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 г. в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками за свободу и независимость нашей Родины». І ніжэй — дзясяткі прозвішчаў.

А яшчэ Расна на рэчцы Вярбоўка — запаведнік скарбаў. У 1910-м сяляне аралі поле і знайшлі скарб залатых і сярэбраных манет з Францыі, Бельгіі, Іспаніі, Польшчы і Расіі. Наторкнуўся плуг непадалёк ад руін касцёла на схаваны чыгунок і ў 2013-м. Праўда, ужо не манеты там былі, а сервіз 1920-х з парцалянавага завода ў Дулёва. Для ўладальніка была, значыць, найвялікшая каштоўнасць.





### МАЛЬВЫ І КАРМЕЛІТЫ

А праз паўгадзіны мы заязджаем у Мсціслаў. Працытую кнігу гісторыка Уладзіміра Краснянскага 1912 г.: «Благодаря высокому положению, город ярко вырисовывается с своими церквами и садами уже за 10 верст, с какой стороны ни приближаешься к нему, и представляет картину, достойную кисти художника».

І першай нашай лакацыяй сапраўды быў храм. «Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці. Гэты храм мог бы зрабіць гонар кожнаму гораду, тым больш што ў ім зберагліся вельмі рэдкія на Беларусі фрэскі на свецкія тэмы. Зробленыя яны па свежых слядах здарэння, і зроблены здарова», — пісаў Уладзімір Караткевіч. Фрэскі тыя прысвечаны «Трубяцкой разні» — у 1654-м Мсціслаў быў узяты войскамі князя Трубяцкога. Палова жыхароў горада і ўсе мніхі кармеліцкага кляштара тады загінулі.

У гародчыках вакол касцёла квітнеюць мальвы, падкрэсліваючы бель велічных сцен... А вось унутр не трапілі. Толькі праз шчыліну паглядзелі на бляск пазалоты дзівоснага алтара з разьбой, які рэстаўрыруецца... Ды на будаўнічыя рыштаванні. Шарэюць, як і дзесяць гадоў таму... Як і сорак, падчас візіту Уладзіміра Караткевіча. На маруднасць рэстаўрацыі яшчэ ён наракаў.

Не ўдалося на гэты раз спусціцца ў сутарэнні, з якіх вялі хады ва ўсе храмы горада... Значыць, і ў езуіцкі касцёл Святога Міхаіла Архангела.

### ЧАМУ АДВАРОЧВАЕЦЦА ПЁТР МСЦІСЛАВЕЦ?

Вакол касцёла таксама будаўнічыя лясы... А побач — помнік Пятру Мсціслаўцу. Устаноўлены ў 1986 годзе, гэта дыпломная работа скульптара Мікалая Маліноўскага. Цікава, што, калі шукаеш ракурс для фатаграфавання, юны бронзавы Мсціславец упарта адварочваецца так, каб у аб'ектыў не траплялі руіны касцёла... Ясна, што тады, у савецкія часы, помнік адмыслова арыентавалі так, каб за ім былі «правільныя» будынкі мясцовай адміністрацыі, а не заняпалае культавае збудаванне.

«І каб малы Мсціслаў нават нікога больш не даў чалавецтву — хапіла б і гэтага, каб людзі засталіся навекі ўдзячныя яму. І, як слабую даніну падзякі, паставілі б Пятру Мсціслаўцу помнік у яго родным горадзе. Помнік, які пакуль што ўзвышаецца толькі ў сэрцах жыхароў Мсціслава», — пісаў Караткевіч сорак гадоў таму.

Сёння помнікаў першадрукару ў Мсціславе аж два. Так і хочацца іх назваць «Пётр Першы Мсціславец» і «Пётр Другі Мсціславец». Другі адкрыты 2 верасня 2001 года падчас Дня беларускага пісьменства, сталіцай якога быў Мсціслаў. Пачула амаль анекдот: быццам бы аб'ёмныя надпісы з новага помніка, «Пётр» і «Мсціславец», па чарзе скрадвалі нейкія няўдалыя зладзеі — прынялі фарбаваныя чыгунныя літары за бронзавыя. Проста як Панікоўскі і Шура Балаганаў у «Залатым цяляці».

Караткевіч пісаў пра Пятра Мсціслаўца: «Мы не ведаем года яго нараджэння і смерці, не ведаем, дзе ён вучыўся друкарскай справе, на радзіме ці яшчэ недзе (друкаваная старажытнабеларуская кніга лічыла тады за сабою ўжо амаль палову стагоддзя). Адзіныя вехі яго жыцця — гэта кнігі, выдадзеныя ім».

Сёння вядома крыху больш. Нарадзіўся Петр Цімафеевіч Мсціславец у купецкай сям'і Цімафея і Еўдакіі. Разам са стрыечным братам маці — майстрам-будаўніком Васілём трапіў на заробкі ў Маскву. Там разам з Іванам Фёдаравым, які, дарэчы, таксама родам з Беларусі, старажытнага шляхецкага роду герба «Шрэнява», выдаў «Апостал» — пачатак адліку расійскай друкаванай кнігі... Потым з тым жа Фёдаравым працаваў у Заблудаўскай друкарні, потым — у Віленскай, купцоў Мамонічаў, потым — у Астрожскай... «Ёсць звесткі, што, па прыкладзе Скарыны, нашы майстры хацелі выдаць усё гэта ў перакладзе на простую мову, «каб научение людем ширилося». Чамусьці гэта не атрымалася. А шкада», — піша Караткевіч пра Заблудаўскі перыяд біяграфіі друкара.

### ЗАМАК І ЯБЛЫКІ

Караткевіч увесь час вучыў, што беларусам трэба перастаць азірацца на чужое і навучыцца цаніць сваё... Будынак з чырвонай цэглы, цырульня пад гучнай назвай «Парыж». Гучна абураюся — зноў правінцыйнае імкненне да «высокага». Пакуль не прачытваю шыльдачку: «Будынак былога дваранскага сходу і гасцініцы «Парыж». Канец XIX — пачатак XX стагоддзя». Назва, аказваецца, гістарычная!

Перамогай гістарычнай справядлівасці выглядае і Замкавая гара. Месца, дзе ўзнік горад, дзе бараніў Мсціслаў князь Сямён Лугвен... Калі мы падымаліся сюды дзесяць гадоў таму, толькі марылі, каб тут аднавіць стары драўляны замак... Бо і тады тут праводзіліся рыцарскія фэсты і від зверху фантастычнай прыгажосці... Дык вось, ёсць замак! Вядома, збольшага ўмоўны, але турыстам ёсць дзе пахадзіць, падзівавацца, падняцца на вежы...

З яблынь у двары Мсціслаўскага замка падаюць у пакуль не стаптаную рыцарамі траву спелыя яблыкі.

Яшчэ навіна: на падыходзе да Замкавай гары цяпер — узведзеная ў гонар 905-годдзя Мсціслава капліца благавернага князя Расціслава Мсціслаўскага, які і заснаваў тут у 1135 годзе горад.

А дарогі такія, што ўвесь час успамінаеш паездкі ў горныя мясціны — рэчка Віхра пастаралася... І дамы ўпрыгожаныя адмыслова, такога, здаецца, больш нідзе не бачыла: то там, то там на ганку — чатыры невялікія разныя калоны, фарбаваныя ў сіні, жоўты, зялёны, брунатны... Шкада, не выробляюць у мястэчку адмысловую мсціслаўскую кафлю, рознакаляровую, з малюнкамі, як умеў мясцовы майстар Сцяпан Палубес, вывезены ў XVII стагоддзі ў Маскву, — яго працу там можна шмат дзе пабачыць, на Круціцкім падвор'і, у Крамлі...

Не толькі кафлю, але і кнігі тут стваралі адмысловыя. У 1920-х у Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме ўзнікла літаратурная група «Амсціслаўцы»: Змітрок Астапенка, Аркадзь Куляшоў і Юлі Таўбін. Яркія зоркі беларускага пісьменства. Ацалеў ад рэпрэсій адзін Куляшоў... Таўбіна расстраляюць у 1937-м, Астапенку з сібірскіх лагераў у 1942-м возьмуць у разведку — ён жа сцвярджаў, што валодае надзвычайнымі здольнасцямі і можа сарыентавацца ў любым месцы зямлі. Загіне ў Татрах... Зрэшты, яго лёс стане таямніцай, бо Аркадзь Куляшоў сцвярджаў, што бачыў сябра ў Маскве пасля вайны.

За дзень усё ў гэтым горадзе не агледзіш, у адным артыкуле не апішаш... «Абяцаная шапка на вушы не лезе», — папярэджваў у сваім «Слоўніку беларускіх прыказак і загадак» слынны Іван Насовіч, які жыў і працаваў тут, у Мсціславе.

Няхай жа для вас згадка пра старажытны беларускі горад будзе падставай наведаць яго ці хоць бы прачытаць натхнёных ім пісьменнікаў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Кропка на карце

# МАЛЕНЬКІ ВЕРСАЛЬ

## на беразе беларускай Амазонкі

**Гэтыя мясціны маглі стаць другім у Беларусі курортным пасёлкам. Да аварыі на Чарнобыльскай электрастанцыі ў Нароўлю любілі прыязджаць на адпачынак не толькі жыхары з розных беларускіх гарадоў, але і масквічы і піцерцы. Ну дзе яшчэ вы знойдзеце горад, дзе з цэнтральнай плошчы можна выйсці на гарадскі пляж?**

Горад абгінае прыгажуня Прыпяць, якую ў нашай краіне празвалі беларускай Амазонкай. З даўніх часоў на гэту прыгажосць ішлі людзі — у раёне знойдзены стаянкі каменнага веку, шматлікія прадметы, якія датуюцца эпохай бронзавага веку. Пра гэтыя мясціны пісаў яшчэ Герадот, а старажытныя пасяленцы неўры пакінулі пасля сябе багата тапонімаў, дарэчы, назва «Нароўля» — адзін з іх. У розныя гады землі Нараўляншчыны ўваходзілі ў склад Тураўскага, Кіеўскага княстваў, ВКЛ і Расійскай імперыі.

**Адзін з сімвалаў Нароўлі — далікатная бялюткая альтанка. Яе, размешчаную на беразе, маглі бачыць падарожнікі, што плылі па Прыпяці.**

Сёлета Нароўлі спаўняецца 440 гадоў. Не прапусціце святкаванні, якія пройдуць у лістападзе.





### ТРАГЕДЫЯ І ВЯРТАННЕ

За год да трагедыі 1986 года ў маленькай Нароўлі адкрыўся сучасны кінатэатр. А ўсяго за дзень да бяды мясцоваму вучылішчу механізатараў было прысвоена званне гаспадаркі высокай культуры — сюды з усёй Гомельшчыны звазілі на рамонт сельгастэхніку. Жыхары гарадка бачылі добрыя перспектывы для яго развіцця, планавалі, марылі, чакалі гасцей. А ў маі 1986-га адсюль ужо вывозілі скот, калоны аўтобусаў з дзецьмі накіроўваліся ў незабруджаныя раёны. Да лета горад апусцеў, на вуліцах можна было сустрэць адзінкавых мінакоў. І толькі палівачныя машыны змывалі з дамоў і дарог альфа-часціцы.

У верасні дзеці вярнуліся. Запрацавалі школы, людзі, якія ўзводзілі новыя дамы, чакалі наваселляў. У 1991 годзе нават адкрылася школа мастацтваў. Нараўляншчына ўсё яшчэ спадзявалася на добрае.

У 1991 годзе пачалося адсяленне, людзі з'язджалі сем'ямі. І гэты працэс цягнуўся да 2007 года. Больш за 10 тысяч жыхароў пакінулі родныя мясціны. А да чарнобыльскай аварыі насельніцтва раёна складала каля 30 тысяч.

**Толькі людзьмі, якія абслугоўвалі дом, гаспадарку, парк, была заселена цэлая вуліца.**

Штовесну тут згадваюць дату, калі адбылася трагедыя, праводзяць мітынгі. У цэнтры горада стаіць помнік, які нагадвае пра адсяленне з забруджаных тэрыторый, тры сотні вёсак перасталі існаваць. На месцы сцёртых Чарнобылем жылых мясцін знаходзіцца Палескі радыяцыйны запаведнік. Сёння там выдатна пачуваюць сябе жывёлы і расліны, у тым ліку чырванакніжныя...




Калі гуляеш па беразе Прыпяці, міжволі адчуваеш востры боль, праз які прайшлі адсяленцы. Ну як можна было з'ехаць з такіх чароўных мясцін!

Можа, таму людзі, якія тут жывуць сёння, не любяць гаварыць на тэму Чарнобыля. Тут не хочуць жыць шкадаваннем мінулага, а выбіраюць шлях надзеі, ствараюць умовы для таго, каб Нароўля квітнела сёння і заўтра. І зараз гэта адзіны раён Гомельшчыны, дзе хутка павялічваецца нараджальнасць, расце колькасць маладых сем'яў. Толькі за 2015—2020 гады ў раёне ўведзена ў эксплуатацыю больш за 11 тысяч квадратных метраў жылля. Для шматдзетных сем'яў з дзяржпадтрымкай пабудавана 25 індывідуальных жылых дамоў агульнай плошчай 3175 квадратных метраў.

А школа мастацтваў, якая адкрылася ў Нароўлі ў 1991 годзе, кожную восень робіць вялікія наборы дзяцей, якія сваімі талентамі, творчасцю будуць прыносіць гэтай зямлі святло і радасць.

### КАЛАРЫТ МІНУЛАГА

Любімае месца для прагулак моладзі і мам з вазочкамі ў Нароўлі — парк, які прымыкае да палаца, што ўзводзіўся тут у канцы XIX стагоддзя. Яго плошча 8,2 гектара. У час яго закладкі сюды завозілася багата розных саджанцаў. Толькі таполяў было пяць відаў, з'явіліся акацыі і шаўковіцы, персідскі бэз. Сёння парку патрабуецца «рэанімацыя». Ён моцна пацярпеў у гады Другой сусветнай вайны — быў увесь перакапаны. Немцы разлічвалі, што былыя ўладальнікі, калі пасля рэвалюцыі ў спешцы пакідалі сваё жытло, маглі дзесьці закапаць клад. Таксама дрэвы высякаліся на дровы. Пасля аварыі на ЧАЭС паркам таксама ніхто не займаўся. Але мясцовыя жыхары вераць, што яшчэ ўдасца аднавіць былую прыгажосць, пакрысе ў парку з'яўляюцца новыя пасадкі.

Сёння тут дзейнічае футбольнае поле, яно знаходзіцца на месцы былога тэніснага корта (дарэчы, ён уваходзіў у дваццатку першых, што з'явіліся на беларускіх землях). У 1905 годзе ён ужо быў электрыфікаваны — тут маглі праводзіцца працяглыя спаборніцтвы паміж аматарамі тэніса.



З набыццём гэтых земель у Нароўлі родам Горватаў стаў мяняцца мясцовы ўклад. Актыўнасць новых гаспадароў спрыяла эканамічнаму пад'ёму краю. Тут працавала піваварня, гадавалі скот, які прадавалі ў Пецярбург, гандлявалі нават нараўлянскім сенам — яго сплаўлялі па Прыпяці ў бок Адэсы. Былі тут і шыкоўныя канюшні — нават іх афармленне было няпростым, з імітацыяй калон. Толькі людзьмі, якія абслугоўвалі дом, гаспадарку, парк, была заселена цэлая вуліца.



Захавалася паданне, што гаспадары прывезлі з Адэсы каваля, прапанаваўшы таму працу на даволі выгадных умовах. Адзінае, што папрасілі майстра, — змяніць прозвішча на Пераход (як чалавек, які перайшоў на новае месца). Сёння гэта распаўсюджанае нараўлянскае прозвішча.

Калі ў Нароўлі на беразе Прыпяці ствараўся палацава-паркавы комплекс, над ім працавалі архітэктары з Еўропы. Ідэі збіраліся, пазычаліся, пераасэнсоўваліся. А пасля паўставалі ў выглядзе малых архітэктурных форм, якія ўмела дапаўнялі прыродныя краявіды. Адзін з сімвалаў Нароўлі — далікатная бялюткая альтанка. Яе, размешчаную на беразе, маглі бачыць падарожнікі, што плылі па Прыпяці. Ёсць паданне, быццам пан узвёў гэтую далікатную вежу ў памяць пра патанулую дачку, якую звалі Альтана.

Альтанка была своеасаблівай візітоўкай гаспадароў, сведчыла пра іх заможнасць, прэзентабельнасць, густ. Раней побач з ёй працавала прыстань, людзі на цеплаходах плавалі ў Мазыр і Кіеў, нейкі час тут выгружаліся грузавыя суды, захаваліся нават архіўныя здымкі, якія сведчаць пра бойкі гандаль. Сёння бераг ужо парос вялікімі дрэвамі, а ў былым партовым памяшканні месціцца бар.

### НАДЗЕЯ НА ЛЕПШАЕ

А вось капліца і усыпальніца, што знаходзіліся побач з ракой, не захаваліся — Прыпяць падмыла бераг.

За палацам можна заўважыць рэшткі фантана і каменныя крэслы ў рымскім стылі з вялікімі львінымі лапамі. Адразу адгадваюцца сляды былой раскошы. У свой час палац Горватаў называлі маленькім Версалем. Сюды з'язджаўся мясцовы бамонд, ладзіліся творчыя вечары.

**Людзі, якія тут жывуць сёння, не любяць гаварыць на тэму Чарнобыля. Тут не хочуць жыць шкадаваннем мінулага, а выбіраюць шлях надзеі, ствараюць умовы для таго, каб Нароўля квітнела сёння і заўтра.**

Каля цэнтральнага ўвахода быў пад'ём для карэт, гасцей сустракалі бронзавыя львы памерам у натуральную велічыню, а паўночны фасад ахоўвалі вялізныя сфінксы. У адным з памяшканняў размяшчаўся музей прыроды Палесся. Тут былі чучалы жывёл, гнёзды птушак, заспіртаваныя яшчаркі... Далей размяшчаліся жылыя і ванныя пакоі. У палацы быў водаправод (з'явіўся ў пачатку XX стагоддзя). Правялі сюды і электрычнасць. У гасцявым пакоі стаяў французскі ложак, на якім госці не маглі заснуць, бо ён быў занадта шыкоўны. На другі паверх вяла парадная лесвіца. Горваты мелі цудоўную бібліятэку, прыгожыя салоны: блакітны — для гаспадыні, чырвоны — для гаспадара.

У гады Вялікай Айчыннай вайны немцы выкарыстоўвалі палац як шпіталь, а ў сутарэннях размяшчалася гестапа. Пры адступленні акупанты ўзарвалі будынак. Дах абваліўся, усе драўляныя дэталі згарэлі. Пасля рамонту тут размяшчаўся дом-інтэрнат. Пасля яго закрыцця ў сувязі з чарнобыльскай аварыяй будынак каля трох дзесяцігоддзяў прастаяў у запусценні.

Сёння з'явілася надзея на яго вяртанне... Гэты будынак заўсёды любіў гасцей. У будучыні тут плануецца зрабіць міні-гатэль. І тыя, каго прываблівае Нароўля, будуць прывозіць адсюль здымкі не толькі з альтанкай, але і з маленькім Версалем.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ДУХ І МОЦ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА

## Аўтары помніка Івану Шамякіну — аб сумеснай працы і вобразнасці скульптуры

**Адным з бясцэнных падарункаў Добрушу падчас святкавання Дня беларускага пісьменства стала адкрыццё помніка народнаму пісьменніку Беларусі Івану Шамякіну. Аўтары кампазіцыі, вага якой складае каля 10 тон, Уладзімір Піпін і Канстанцін Касцючэнка, распавялі «Звяздзе» аб тым, як ішла праца над праектам.**



— У нас зладжаны калектыў, мы каля 15 гадоў працуем разам, — адзначыў Уладзімір Піпін. — Разам стварылі ўжо не адну работу, у тым ліку і помнік Івану Шамякіну. Скульптура — у прынцыпе цяжкая фізічная праца, асабліва калі трэба ўкласціся ў пэўны тэрмін. Таму дапамога сааўтара проста неабходна.

Падчас работы над праектам скульптары звярталіся і да сваякоў Івана Шамякіна, у распрацоўцы кампазіцыі ім дапамагала дачка пісьменніка Алеся Шамякіна.

— Алеся Іванаўна прымала актыўны ўдзел пры стварэнні мадэлі ў гліне, — падзяліўся Канстанцін Касцючэнка. — Звычайна падчас працы над такімі праектамі нельга абысціся без дапамогі сваякоў і блізкіх, яны падказваюць дэталі, якія маюць вялікае значэнне.

Скульптары прызналіся, што падчас работы адчувалі вялікую адказнасць:

— Іван Шамякін трэці з нашых народных пісьменнікаў, вобраз якога ўвасабляецца ў скульптурнай пластыцы. Да гэтага помнікі былі створаны Янку Купалу і Якубу Коласу, — распавёў Канстанцін Касцючэнка. — Таму, распрацоўваючы вобраз, эскіз і ўдалейшым саму мадэль помніка, мы разумелі, што кампазіцыя павінна быць на адным узроўні са скульптурамі Купалы і Коласа. Мы імкнуліся да таго, каб помнік увабраў у сябе ўсю энергетыку, унутраны змест твораў Шамякіна.

— Падчас работы над помнікам мы ўлічвалі глыбіню і маштабнасць асобы пісьменніка. Стварыць з вобраза чалавека сур'ёзны мемарыяльны аб'ект — гэта складаная задача, якую не кожны скульптар можа вырашыць. Але, мяркую, у нас атрымалася — помнік адлюстроўвае дух і моц Івана Шамякіна, — падсумаваў Уладзімір Піпін.

**Арына КАРПОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 26 сентября 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 119 363,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

